Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны"

ГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

**В. А. АДЗІНОЧАНКА**

# ГІСТОРЫЯ ФІЛАСОФІІ

Практычнае кіраўніцтва

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2014

УДК 94:1(076.5)
ББК 87.3я73
А 299

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук Р. Р. Лазько;
кандыдат філасофскіх навук В. К. Барэцкая

Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам
установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны»

**Адзіночанка, В. А.**
А 299 Гісторыя філасофіі : практ. кір-ва / В. А. Адзіночанка ; М-ва адукацыі РБ, Гом. дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – 48 с.
ISBN 978-985-439-940-9

Разгледжана гісторыя філасофіі, пачынаючы з VI ст. да н. э. Асноўная ўвага надаецца еўрапейскай філасофскай традыцыі. Кожнае філасофскае вучэнне разглядаецца ў кантэксце яго гістарычнай і культурнай сітуацыі. Прааналізавана спецыфіка філасофствавання ў розныя перыяды. Схематычна акрэслена асноўная філасофская праблематыка. Дадзены метадычныя парады студэнтам па засваенню розных філасофскіх вучэнняў.

Адрасавана студэнтам вну.

**УДК 94:1(076.5)**
**ББК 87.3я73**

**ISBN 978-985-439-940-9**

© Адзіночанка В. А., 2014
© УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», 2014

# Змест

Уводзіны ........................................................................ 4
Тэма 1. Філасофія Старажытнага Усходу ............................ 7
Тэма 2. Антычная філасофія .................................................. 10
Тэма 3. Філасофія Сярэдніх вякоў ........................................ 16
Тэма 4. Філасофія Адраджэння ............................................ 18
Тэма 5. Філасофія Новага часу ............................................. 20
Тэма 6. Філасофія Асветніцтва ............................................. 23
Тэма 7. Нямецкая класічная філасофія ................................. 25
Тэма 8. Філасофія марксізму ................................................. 28
Тэма 9. Філасофія К'еркегора, Шапенгаўэра, Ніцшэ ............. 30
Тэма 10. Філасофія XX стагоддзя .......................................... 33
Тэма 11. Руская філасофія ..................................................... 40
Тэма 12. Філасофія Беларусі .................................................. 43
Літаратура ............................................................................ 47

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Уводзіны

Дадзенае кіраўніцтва прызначана для самастойнай работы студэнтаў пры падрыхтоўцы да семінараў па гісторыі філасофіі.

Неабходнасць яго выдання абумоўлена двума фактарамі: па-першае, тым, што курс гісторыі філасофіі прадугледжвае вывучэнне вялікай колькасці фактычнага матэрыялу, які можна толькі схематычна выкласці ў лекцыях, і таму студэнты павінны самі засвойваць значную яго частку. Па-другое, успрыманне любых філасофскіх ведаў патрабуе асабістых намаганняў дзеля таго, каб разабрацца ў тых праблемах, аб якіх ідзе размова. Таму толькі фармальнае праслухванне курса лекцый і потым здача заліку не дасць патрэбнага выніку.

Метадалагічныя прынцыпы, якія ўжываюцца ў кіраўніцтве, шмат у чым вызначаюцца спецыфікай самой філасофіі. *Філасофія* (ад грэч. *phileo – люблю* і *sophia – мудрасць*) у перакладзе азначае *любоў да мудрасці*. Лічыцца, што слова *філосаф* упершыню ўжыў старажытнагрэчаскі матэматык і мысліўца Піфагор у дачыненні да людзей, якія імкнуцца да высокай мудрасці і годнага ладу жыцця. Тлумачэнне і замацаванне ў еўрапейскай культуры тэрміну *філасофія* звязваюць з імем старажытнагрэчаскага мысліўцы Платона. Ён сцвярждаў, што мудрымі могуць быць адныя багі, людзі ж здольныя толькі імкнуцца да мудрасці, любіць яе. Тых, хто гэтым займаецца, Платон называў філосафамі, а іх занятак – філасофіяй.

Трэба ўлічваць, што азначэнне філасофіі – адна з глыбокіх філасофскіх праблем, ад вырашэння якой шмат у чым залежыць і трактоўка яе гісторыі. Азначэнне, з якога мы будзем зыходзіць з'яўляецца адным з магчымых: *філасофія* – гэта спосаб вывучэння і асэнсавання найбольш агульных і фундаментальных асноў рэчаіснасці і спосабаў яе развіцця, а таксама сістэма ведаў, якая ўзнікла на гэтым грунце.

У розныя часы існавала рознае разуменне, што такое мудрасць, таму мяняўся прадмет філасофіі. Пры вывучэнні кожнага з этапаў развіцця філасофіі карысна вылучыць яго асноўны прынцып. Так для антычнай філасофіі ў цэлым характэрны касмацэнтрызм, для сярэднявяковай – тэацэнтрызм, для філасофіі Адраджэння – антрапацэнтрызм, для філасофіі Новага часу – навукацэнтрызм, для філасофіі XX ст. – разнастайнасць філасофскіх школ і палеміка з папярэдняй традыцыяй, для філасофіі постмадэрнізму – сцвярджэнне аб канцы філасофскага развіцця. Безумоўна, такія характарыстыкі з'яўляюцца спрошчанымі і не ахопліваюць разнастайнасці філасофскай думкі таго ці іншага перыяду, але яны даюць схему яе разумення.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Пры вывучэнні гісторыі філасофіі важна разумець заканамернасці яе развіцця. Схематычна мы вылучым дзве іх разнавіднасці:

1. Знешнія заканамернасці. Філасофія з'яўляецца выражэннем асноўных тэндэнцый культуры сваёй эпохі і вызначаецца імі. Напрыклад, культура сярэдніх вякоў мела пераважна рэлігійны характар. Культура Новага часу грунтавалася на навуковым разуменні свету. Гэта адлюстравалася і на філасофскай праблематыцы. 2. Унутраныя заканамернасці. Для філасофскага развіцця характэрна пераемнасць. Напрыклад, вучэнне Сакрата склалася ў палеміцы з сафістамі, Платон даў сваё тлумачэнне ўзнятых Сакратам праблем, Арыстоцель палемізаваў з Платонам. Такім чынам, можна казаць аб адзінай філасофскай традыцыі і пераемнасці паміж вучэннямі.

Таму пры вывучэнні думак таго ці іншага філосафа трэба адказаць на пытанні: 1. Якія тэндэнцыі часу яны выражаюць? 2. На якія папярэднія вучэнні абапіраюцца, як суадносяцца з думкамі іншых філосафаў і які ўплыў аказалі на далейшае развіццё філасофіі?

Таксама для разумення шматлікіх філасофскіх вучэнняў карысна ўжываць тую ці іншую тыпалогію. Назавем толькі асноўныя з іх.

Нямецкі філосаф і логік Ф. Трэндэленбург (1802–1872) прапанаваў сістэматызаваць філасофскія вучэнні ў залежнасці ад вырашэння праблемы ўзаемаадносін суб'екта і аб'екта і на гэтай падставе вылучаць ідэалізм і матэрыялізм як асноўныя накірункі ў філасофіі. Гэты падыход быў запазычаны Ф. Энгельсам і з'яўляўся найбольш распаўсюджаным ў афіцыйнай савецкай філасофіі.

В. Дзільтэй (1833–1911) мадыфікаваў схему Трэндэленбурга і вылучыў тры асноўныя разнавіднасці філасофскіх вучэнняў: натуралізм (Дэмакрыт, Гобс, Гальбах, сенсуалізм, матэрыялізм як метафізіка), ідэалізм свабоды (Анаксагор, Сакрат, Платон, Арыстоцель, Цыцэрон, Кант, Русо, шэраг хрысціянскіх філосафаў) і аб'ектыўны ідэалізм (элеаты, Геракліт, Бруна, Гегель, Шапенгаўэр).

Своеасаблівую гісторыка-філасофскую тыпалогію прапанаваў К. Ясперс (1883–1969). Ён вылучыў: 1) мысліўцаў, якія аказалі на чалавецтва найбольш глыбокі ўплыў (Сакрат, Буда, Канфуцый, Ісус); 2) уласна філосафаў; 3) мысліўцаў, якія былі пісьменнікамі і ўздымалі ў сваіх творах філасофскія праблемы (грэчаскія трагікі, Дантэ, Шэкспір, Гётэ, Гельдэрлін, Дастаеўскі і інш.).

Пры класіфікацыі філасофскіх вучэнняў мы будзем зыходзіць з трох крытэрыяў: 1) часу (гістарычнага перыяду): антычная філасофія, сярэднявяковая філасофія, філасофія Адраджэння і г. д.; 2) прасторы (рэгіёна): усходняя філасофія, еўрапейская філасофія, руская філасофія і г. д.; 3) школы і накірунка: сафісты, кінікі, схаласты, экзістэнцыялісты і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Такім чынам, вучэнне кожнага філосафа можа быць ахарактарызавана па трох параметрах. Напрыклад, вучэнне Фамы Аквінскага належыць да: 1) сярэдневяковай філасофіі; 2) заходнееўрапейскай філасофіі; 3) схаластыкі.

Трэба разумець тую мэту, якая ставіцца пры выкладанні курса гісторыі філасофіі на нефіласофскіх спецыяльнасцях. Яна мае азнаямляльны характар. У студэнтаў павінна быць сфарміравана самая агульнае і павярхоўнае ўяўленне аб розных філасофскіх вучэннях, іх месцы ў культуры і механізмах развіцця. Такім чынам, у кіраўніцтве дадзены агульныя схемы, якія павінны аблегчыць вывучэнне філасофскай думкі таго ці іншага перыяду. Рэкамендуецца пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў пазнаеміцца з гэтымі схемамі і потым пачытаць літаратуру па адпаведнай тэме.

Літаратура, спіс якой прыведзены ў кіраўніцтве, мае азнаямляльны і агульны характар. Неабходна ўлічваць, што, каб пазнаёміцца з думкамі таго ці іншага філосафа, трэба чытаць яго ўласныя творы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Тэма 1. Філасофія Старажытнага Ўсходу

Пры вывучэнні філасофіі Старажытнай Індыі і Старажытнага Кітая трэба ўлічваць, што яны – часткі іншай культурнай традыцыі. Таму неабходны пэўныя намаганні для разумення іх палажэнняў. Філасофія гэтых краін не аддзелена ад рэлігіі.

Індыйская філасофія фарміруецца на грунце палажэнняў ведызму (іх прызнання альбо адмаўлення), які ўзнік у другой палове II тысячагоддзя да н. э. у выніку ўзаемадзеяння вераванняў і абрадаў мясцовых плямён і рэлігіі арыяў. Сваю назву ён атрымаў ад чатырох зборнікаў рэлігійных гімнаў і заклінанняў – Ведаў (Рыгведа, Самаведа, Яджурведа, Атхарваведа).

У VIII ст. да н. э. на грунце ведызму ў Індыі ўзнікае брахманізм. У гэты перыяд індыйскае грамадства канчаткова падзяляецца на чатыры класы людзей – варны брахманаў, кшатрыяў, вайш'яў і шудр. На гэты падзел трэба звярнуць асаблівую ўвагу. У аснове пабудовы традыцыйнага індыйскага грамадства – прынцып няроўнасці паміж людзьмі.

Асноўныя палажэнні брахманізму выражаны ў трактатах ва Упанішады (VII–VI стст. да н. э .): 1. Уяўленне аб дхарме – безасабовым усеагульным і вечным парадку, які ўтрымлівае і захоўвае Сусвет як адзінае цэлае. Дхарма разумеецца як абавязак чалавека і саслоўя, да якога апошні належыць. 2. Вучэнне аб перасяленні душ (сансары). Згодна з ім, пасля смерці душа чалавека не знікае, але перасяляецца ў іншую істоту альбо прадмет у адпаведнасці з кармай – сукупнасцю ўчынкаў. 3. Вучэнне пра Брахмана – вышэйшую абсалютную рэчаіснасць, ілюзорным адлюстраваннем якой з'яўляецца наш бачны свет. Мэтай жыцця лічылася зліццё індывідуальнай душы, якая называлася Атман, з Брахманам.

Філасофскія сістэмы брахманізму стварылі ў сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э. трывалую падставу для з'яўлення будызму, які ўзнік у VI ст. да н. э. у Паўночнай Індыі. Яго заснавальнікам з'яўляецца Сіддхартха Гаўтама Шак'ямуні (623–544 да н. э.).

Асновай будызму з'яўляецца этыка, якая грунтуецца на чатырох высакародных ісцінах: 1) усё жыццё ёсць зло і пакуты; 2) прычынай пакут з'яўляюцца жаданні; 3) каб пазбавіцца ад пакут, трэба пазбавіцца ад жаданняў; 4) каб пазбавіцца ад жаданняў, трэба ісці па “высакароднаму васьмярычнаму шляху”, які ўказаў Буда. Яго канчатковай мэтай з'яўляецца дасягненне нірваны.

Усе філасофскія школы Старажытнай Індыі падзяляюцца на дзве групы: астыка – якія прызнаюць аўтарытэт Вед (міманса, веданта,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

санекхья, ёга, ньяя, вайшэшыка) і настыка – не прызнаюць аўтарытэту Вед (лакаята і аджывіка).

У адрозненне ад Індыі, у культуры Кітая вельмі вялікую ролю ігралі сацыяльная этыка і адміністратыўная практыка. Мала надавалася ўвагі метафізічным разважанням і індывідуалістычным пошукам выратавання.

Згодна са старажытнакітайскай касмагоніяй, спачатку існавала толькі адзіная ўніверсальная субстанцыя. У нейкі момант яна падзялілася на два пачаткі: *янь* – цёплае і светлае і *інь* – мутнае і халоднае. Старажытныя кітайцы таксама верылі ў існаванне Вярхоўнай Вышэйшай сілы, якая называлася Небам альбо Шан-дзі (Вярхоўным Уладаром).

У VI–V стст. да н. э. старыя веды і ўяўленні, якія раней успрымаліся як закон, перасталі адпавядаць новым умовам жыцця. У Кітаі наступіў смутны час – перыяд Ваюючых царстваў. Пахіснуліся самыя ўмовы жыцця. Як адказ на патрэбу ў новым светапоглядзе ўзніклі даасізм і канфуцыянства.

Канфуцыянства – этыка-палітычнае вучэнне, заснаванне якога прыпісваецца вялікаму кітайскаму мысліцелю Канфуцыю (551–479 да н. э.). Яно лічыцца канцэнтраваным выражэннем кітайскага нацыянальнага светапогляду і важным ідэйным рэгулятарам, які доўгі час вызначаў жыццё краіны. Каб выйсці з крызісу, лічыў Канфуцый, трэба ўзнавіць мінулы парадак, які падаваўся ў ідэалізаваным выглядзе. Неабходна, каб усё стала на свае месцы: “Няхай бацька будзе бацькам, сын – сынам, імператар – імператарам, чыноўнік – чыноўнікам”. У аснове канфуцыянства ляжыць ідэя гармоніі прынцыпаў асабістага маральнага ўдасканальвання і дзейнасці, накіраванай на ўпарадкаванне дзяржавы. Ідэальнае грамадства, па Канфуцыю, гэта перш за ўсё грамадства ідэальных людзей. Ідэальная асоба – гэта высакародны муж (*цзюнь-цзы*), і яго высакароднасць вызначаецца не паходжаннем, а строгім і паслядоўным выкананнем нормаў маралі. Высакароднаму мужу павінны быць уласцівы дзве якасці: гуманнасць (*жэнь*) і пачуццё абавязку (*і*).

Заснавальнікам даасізму лічыцца Лао-цзы (гэтае імя перакладаецца як “Стары мудрэц” альбо “Старое немаўля”), які, па паданні, жыў на мяжы VI–V стст. да н. э. Сутнасць свайго вучэння Лао-цзы выклаў у кнізе “Дао дэ цзын” (“Кніга аб Дао і Дэ”). У ёй адлюстравана мадэль свету, дзе над усім пануе Дао – безасабовы закон, які кіруе сусветам. Закон Дао ажыццяўляецца нябачным і неадчувальным чынам, і ўсё адбываецца як быццам бы само па сабе, кіруючыся дабратворнай сілай на карысць усяго – Дэ. “Дао дэ цзын” заклікае вяртацца да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

першапачатковай прыроды, спрашчэння і натуральнасці. Гэты заклік выражаны перш за ўсё ў паняцці “ня-дзеяння” (у вэй). Ён не зводзіцца да бяздзейнасці і пасіўнасці. Пад у вэй разумеецца адмаўленне ад парушэння ўласнай прыроды і прыроды Сусвету і ўключэнне ва ўсеагульнасць быцця.

Легізм (законнікі) узнік у VI ст. да н. э. Яго тэарэтыкамі з’яўляюцца Гуань Чжун (канец VIII–VII стст. да н. э.), Цзы Чань (VI ст. да н. э.), Лі Кэ (IV ст. да н. э.), Шан Ян (IV ст. да н. э.). Легізм сфарміраваўся ў ходзе палемікі з канфуцыянствам па пытаннях дзяржаўнага ладу. Канфуцыянскай *лі* (традыцыі) легісты супрацьпастаўляюць *фа* (закон). Выкананне законаў павінна забяспечвацца сістэмай жорсткіх пакаранняў. Легісты не верылі ў магчымасць праўлення на падставе выканання маральных норм. Яны лічылі, што ўзаемаадносіны дзяржавы і народа могуць быць толькі варожымі. Іх ідэалам з'яўлялася адзіная магутная дзяржава, прынцыпова адрозная ад сям'і. Легісты прапанавалі сістэму цэнтралізаванай адміністратыўнай пабудовы, адзіную сістэму мер, кіравання дзяржавай пры дапамозе ўніфікаванага дзяржаўнага апарату, прынцып прысваення рангаў і прывілеяў за канкрэтныя заслугі, кантроль над вобразам думак падданых, сістэму нагляду за чыноўнікамі, групавую адказнасць. Іх ідэі былі выкарыстаны першым кітайскім імператарам Цынь Шыхуанам (перыяд праўлення: 221–207 гг. да н.э.), а пасля распаду імперыі асіміляваны канфуцыянствам.

## Літаратура

1 Васильев, Л. С. Проблемы генезиса китайской мысли / Л. С. Васильев. – М. : Мысль, 1989. – 309 с.

2 Древнекитайская философия: в 2 т. / составитель Ян Хин-Шун. – – М. : ПринТ, 1994. – Т. 1. – 364 с., Т. 2. – 384 с.

3 Ольденбург, С. Ф. Культура Индии / С. Ф. Ольденбург. – М. : Наука, 1991. – 277 с.

4 Чанышев, А. Н. Курс лекций по древней философии : учебное пособие для студентов и аспирантов философских факультетов и отделений университетов / А. Н. Чанышев. – М. : Высшая школа, 1981. – 373 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

# Тэма 2. Антычная філасофія

Пры вывучэнні антычнай філасофіі, трэба ўлічваць наступныя палажэнні:

1. Культура Грэцыі і Рыма – адна з крыніц еўрапейскай культуры, да якой належым і мы. Пад уплывам грэкаў заходняя цывілізацыя атрымала накірунак развіцця, які вызначыў яе спецыфіку. 2. Менавіта ў Старажытнай Грэцыі ўзнікла тое, што мы называем "філасофіяй". Яна была абсалютна новай з'явай у параўнанні з папярэднім светапоглядам. Філасофія ў іншых культурах успрымаецца намі па аналогіі з еўрапейскай. 3. У Грэцыі была закладзена філасофская традыцыя, якая цягнецца да сённяшняга дня. Усе наступныя філосафы ці спасылаюцца на грэкаў, ці палемізуюць з імі. 4. Асноўныя філасофскія праблемы былі пастаўлены грэкамі. Асэнсаванне глыбіні гэтых праблем дазваляе зразумець, тое новае, што было прынесена ў філасофію мысліўцамі ў далейшым.

Храналагічныя межы антычнай філасофіі ахопліваюць больш чым тысячагоддзе: ад VI ст. да н. э. да 529 г. н. э., калі імператар Юстыніян забараніў язычніцкія школы. Унутры гэтых межаў выдзяляюцца наступныя перыяды:

1. Перыяд натурфіласофіі (VI і V стст. да н. э), калі ў цэнтры разважанняў знаходзіліся праблемы фізіса і космаса. У гэты час існуюць іанійская (мілетцы і Геракліт) і італійская (піфагарэйцы і элеаты) школы.

2. Перыяд класічнай філасофіі (V–IV стст. да н. э). Яму папярэднічае дзейнасць сафістаў, а спецыфіка вызначаецца вучэннямі Сакрата, Платона, Арыстоцеля. У гэты перыяд было адкрыта звышпачуццёвае і ў яўным выглядзе сфармуляваны асноўныя філасофскія праблемы, над якімі будуць разважаць у далейшым.

3. Перыяд эліністычных школ (ад заваёў Аляксандра Македонскага ў IV ст. да н. э. да 529 г н. э.). Дзейнічаюць школы кінікаў, эпікурэйцаў, стоікаў, скептыкаў, неаплатонікаў. У цэнтры іх разважанняў (за выключэннем неаплатонікаў) знаходзіцца індывід. Храналагічна ў гэты перыяд ўваходзіць ранняя хрысціянская філасофія (апалагетыка і патрыстыка), але яна – частка наступнага перыяду.

Пры вывучэнні кожнага з гэтых перыядаў мы можам вылучыць асноўную тэму і схемы разважанняў, уласцівых мысліўцам, якія да яго належаць. Гэта абумоўлівае спрошчанасць разгляду, але дазваляе зразумець праблематыку.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

1. На першым этапе філосафы разважалі аб рэчаіснасці, якую разумелі як *фізіс* (*прырода*) і як *космас* (*упарадкаванае*). Таму кажуць аб натурфіласофіі (ад лац. *natura* – *прырода*) і космацэнтрызме. Першыя філосафы ставілі пытанні: з чаго ўсё ўзнікла і што ляжыць у аснове ўсяго? Такім чынам, у цэнтры іх разважанняў знаходзілася праблема першапачатку.

Заснавальнік Мілетскай школы Фалес (625–547 да н. э.) лічыў такім першапачаткам ваду: усё ўзнікла з вады, ўсё есць вада, і ўсё ператворыцца ў ваду.

Вучань Фалеса Анаксімандр (610–546 да н. э.) лічыў, што адзін канкрэтны пачатак (вада) не можа ляжаць у аснове разнастайнага свету. Таму ён прапанаваў у якасці першапачатку апейрон (у перакладзе з грэчаскай – *неакрэслены, бязмежны*).

Трэці прадстаўнік Мілетскай школы, Анаксімен (588–525 да н. э.), вярнуўся да канкрэтнага пачатку і такім лічыў паветра.

Геракліт з Эфесу (544 г. да н. э. – ?) першапачаткам лічыў агонь. Менавіта з яго пульсацыі ўзнікае свет. Геракліт – вялікі антычны дыялектык, яму прыпісваюцца выказванні "ўсё цячэ і ўсё мяняецца", "у адну раку нельга ўвайсці двойчы". Усё развіваецца праз барацьбу, яна "айцец усяго і цар усяго".

Піфагор (2-я пал. VI – пач. V стст. да н. э.) лічыў, што ў аснове ўсяго ляжаць лічбы. Лічбы ў філасофіі піфагарэйцаў – гэта і матэматычныя велічыні, і фізічныя целы, і жывыя істоты. Кожная лічба нешта ўносіць у свет: адзінка – парадак, акрэсленасць, два – раздваенне, неакрэсленасць, тры – устойлівасць.

Парменід (каля 540–445 да н. э.) парывае з фізічнай традыцыяй. Ён праводзіць адрозненне паміж светам, як яго успрымаюць пачуцці, і светам у рацыянальным мысленні. Быццё (супрацьлеглае небыццю) – адзінае (бо апроч яго може існаваць толькі небыццё, а яго няма) вечнае (можа ўзнікнуць толькі з небыцця, а яго няма), нерухомае (яму няма куды рухацца, бо апроч яго нічога няма), дасканалае (а паколькі для грэкаў найбольш дасканалая фігура – шар, то быццё сферычнае).

Зянон (каля 490–430 да н. э.) не прапаноўваў уласную канцэпцыю свету, але распрацаваў шэраг апорый (грэч. *aporia* – *безвыходнасць*), праз якія абараняў вучэнне Парменіда ("Ахілес і чарапаха", "Страла", "Дыхатамія"), у іх ён прадэманстраваў цяжкасць пераводу пачуццёвых уражанняў на мову паняццяў.

Эмпедокл (490–430 да н. э.) сцвярджаў, што тое, што людзі называюць нараджэннем, на самой справе ёсць аб'яднанне і раз'яднанне. Існуе не адзін, а чатыры вечныя пачаткі, якія адпавядаюць характарыстыкам парменідаўскага быцця: агонь, паветра, вада, зямля.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Анаксагор (500–428 да н. э.) – сцвярджаў, што элементаў столькі, колькі рэчаў. Элементы свету Анаксагор называў семянамі (*гамеамерыямі*). У парадак іх прыводзіць Розум (Нус), ён стварае з хаоса космас.

Дэмакрыт (460 г. да н. э. – ?) вядомы сваім вучэннем аб атамах. Яно грунтуецца на двух палажэннях: 1. Дзяленне да бясконцасці немагчыма, *атам* перакладаецца як *недзялімы*. 2. Існуе таксама і небыццё – пустата. Атамы аднолькавыя па складзе і адрозніваюцца паміж сабой толькі формай і размяшчэннем. Атамы трасуцца ў пустаце.

2. У класічны перыяд была пераасэнсавана праблематыка філасофіі. Аснову ўсяго сталі шукаць не ў прыродных стыхіях, а ў звышпачуццёвых пачатках.

Папярэднічае класічнаму перыяду філасофія сафістаў (грэч. *sophistes* – *мудрэц*). У цэнтры іх разважанняў быў не космас, але чалавек. Спецыфіка сафістаў у тым, што яны стаялі на пазіцыях маральнага рэлятывізму[1]. Сэнс (знакамітае выказванне заснавальніка гэтага кірунку Пратагора (481–411 гг. да н. э.) “Чалавек ёсць мера ўсіх рэчаў”) заключаецца не ва ўзвышэнні чалавека, а ў тым, што няма аб’ектыўнай ісціны, ісцінным можа быць любое выказванне. Крытэрыем ісціны з’яўляецца сам чалавек: “якімі я бачу рэчы, такімі яны і ёсць для мяне, якімі іх бачыш ты – такія яны для цябе”.

Вывучаючы філасофію Сакрата (470–399 да н. э.), трэба ўлічваць два моманты: 1. Яна склалася праз палеміку з рэлятывізмам сафістаў. 2. Неад’емнай яе часткай з’яўляецца асоба самога Сакрата. Сафісты ўяўлялі сябе мудрацамі. Сакрат жа, наадварот, прымаў вобраз чалавека, які нічога не ведае. Праз дыялог, абмеркаванне розных палажэнняў ён імкнуўся знайсці аб’ектыўную ісціну. Шлях гэтага пошуку – дыялектыка Сакрата.

Пра Сакрата мы ведаем амаль выключна з твораў яго вучня Платона (427–347 гг. да н. э.), які зрабіў Сакрата галоўным героем амаль усіх сваіх дыялогаў і выразіцелем сваіх ідэй. У адрозненне ад Сакрата, які не прызнаваў сябе настаўнікам, Платон заснаваў філасофскую школу – Акадэмію (называлася так, таму што знаходзілася ў гаі героя Акадэма).

Да нас дайшлі амаль усе творы Платона. Асноўнымі сярод іх з’яўляюцца: “Апалогія Сакрата”, “Тэатэт”, “Парменід”, “Пір”, “Федр”, Гіпій Вялікі”, “Дзяржава”, “Законы”.

Трэба памятаць, што сэнс філасофіі Платона – у адкрыцці рэчаіснасці звышпачуццёвага. Гэтым яна кардынальна адрозніваецца ад папярэдняй філасофіі, якая шукала прычыны рэчаў фізічнага плану

---

[1] Рэлятывізм (ад лац. *relativus* – *адносны*) – прызнанне адноснасці і ўмоўнасці пазнання, адмаўленне абсалютных этычных нормаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(вада, паветра, зямля, апейрон і г. д.). Гэтыя прычыны не фізічнай прыроды Платон назваў ідэямі. Ідэя – гэта ўзор кожнай рэчы, яе сапраўдны воблік. Гэта сутнасць рэчаў, тое што іх робіць менавіта такімі. Апроч зменлівага свету рэчаў ёсць свет нязменных ідэй.

Платону належыць першая тэорыя ідэальнай дзяржавы. Яна павінна складацца з трох класаў: 1) сялян, рамеснікаў і купцоў; 2) стражаў; 3) правіцеляў. Ёсць тры грамадскія лады, якія імітуюць ідэальны лад: манархія, арыстакратыя, дэмакратыя. І тры, якія яго скажаюць: тыранія, алігархія, дэмагогія.

Арыстоцель (384–322 гг. да н. э.) стварае ўніверсальную сістэму ведаў. Яго працы ахопліваюць усе галіны: 1. Логіка. 2. Фізіка. 3. Метафізіка[1]. 4. Практычная філасофія (этыка, палітыка і г. д.). 5. Эстэтыка.

Трэба памятаць, што філасофія Арыстоцеля склалася ў палеміцы з Платонам. Арыстоцель сцвярджаў, што існуюць не ідэі, а асобныя рэчы. Гэта першасныя сутнасці (гэты чалавек, гэты конь). Агульныя паняцці з’яўляюцца другаснымі сутнасцямі.

Арыстоцель назваў чатыры прычыны існуючага: 1) форма альбо сутнасць; 2) матэрыя альбо субстрат; 3) рухаючая; 2) мэтавая.

У Арыстоцеля ёсць вучэнне пра душу, ён вылучаў яе тры віды: вегетатыўная, пачуццёвая, рацыянальная.

Практычныя навукі, па Арыстоцелю, разглядаюць чалавека як індывіда (этыка) і як члена грамадства (палітыка). Вышэйшае дабро і шчасце, да якога павінен імкнуцца чалавек – гэта ўдасканальванне сябе як разумнай істоты. Арыстоцель вылучаў тры правільныя формы праўлення: манархія, арыстакратыя, палітыка, і тры няправільныя: тыранія, алігархія, дэмакратыя.

Трэба падкрэсліць, што Платон і Арыстоцель – адныя з найбольш вялікіх філосафаў у гісторыі. Іх ідэі аказалі вызначальны ўплыў на далейшае развіццё філасофіі.

3. Элiністычны перыяд звязаны з палітычнымі зменамі. Паход Аляксандра Македонскага (334–323 гг. да н. э.) прывёў да крушэння полісу і стварэння вялікай імперыі, і, як вынік, – да радыкальнага перавароту ў грэчаскім духоўным свеце. Да гэтага грэк адчуваў сябе грамадзянінам полісу, прымаў удзел у яго жыцці. Поліс быў суразмерны чалавеку. Калі стварылася вялікая імперыя, грэкі пераўтварыліся з грамадзян у падданых. Узнікае касмапалітызм, калі айчынай робіцца ўвесь свет. Чалавек пачынае ўспрымацца не як частка поліса, а як індывід.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф.СКОРИНЫ

[1] Грэч. *meta ta physika – пасля фізікі.*

Кінікі. Назва паходзіць ад гімнасія Кінасарга (грэч. *kynosarges – хуткія сабакі*). Заснавальнікам школы быў Антысфен з Афін (каля 450–360 да н. э.). Вёў аскетычны лад жыцця і прапаведваў адмаўленне ад якіх-небудзь патрэбаў, самадастатковасць духоўнага свету (*аўтаркію*) і абыякавасць да ўсяго (*апатыю*). Прапанаваўшы ідэал бязмежнай духоўнай свабоды, Антысфен ставіўся з дэманстратыўнай непавагай да сацыяльных інстытутаў, звычаяў і норм культуры.

Сімвалам руху кінікаў з’яўляецца Дыяген Сінопскі (каля 410–320 да н. э.). Ён не толькі ўзмацніў экстрэмізм Антысфена, але стварыў новы ідэал жыцця надзвычайнай суровасці.

Сэнс фармулёвак Дыягена і Кратэта складаўся ў адмаўленні і выкрыцці вялікіх ілюзій, якія рухалі людзьмі: 1) пагоні за задавальненнямі; 2) зачараванасці багаццем; 3) жаданне ўлады; 4) жаданне славы і поспеху. Устрыманне ад гэтых ілюзій, апатыя і аўтаркія – умова сталасці і мудрасці, якія прыводзяць да шчасця – гэты тэзіс зрабіўся агульным для ўсіх накірункаў элінізму.

Эпікурэізм. Заснавальнік Эпікур (341–270 да н. э.). Заснаваў філасофскую школу ў садзе каля Афін. Яго ідэі выкладаюцца ў некалькіх палажэннях: 1. Рэальнасць можна спасцігнуць пры дапамозе чалавечага розуму. 2. У прасторы рэальнага ёсць месца для шчасця. 3. Шчасце – гэта адсутнасць пакутаў і непакою. 4. Для дасягнення шчасця чалавеку не трэба нічога, апроч яго самога.

Этыка эпікурэізму эўдэманістычная[1]. Сэнсам жыцця лічыцца імкненне да шчасця. Шчасце, згодна з Эпікурам, гэта адсутнасць цялесных пакут (*aponia*), альбо спакой душы (*ataraxia*). Для таго каб быць шчаслівым, трэба пераадолець тры віды страху: 1) перад багамі – яны не ўмешваюцца ў чалавечае жыццё; 2) перад смерцю – пераадольваецца пры дапамозе вядомага прынцыпа Эпікура: “калі мы ёсць – смерці няма, калі ёсць смерць – няма нас”; 3) перад злом – яно мінае. Сваім сучаснікам, пазбаўленым упэўненасці, Эпікур паказаў новы шлях да шчасця. Яго нараджаецца знутры нас, і для яго патрэбна няшмат.

Скептыкі (ад грэч. *skeptikos – той, хто разглядае, даследуе*) – філасофская школа, якая зыходзіла з сумнення ў існаванні якога-небудзь надзейнага крытэрыя ісціны.

Заснавальнік – Пірон з горада Эліда (каля 360–270 да н. э.) сцвярджаў, што можна жыць разумна і шчасліва нават пры адсутнасці ісціны і каштоўнасцей. Хто хоча быць шчаслівым, павінен адказаць на тры пытанні: 1. Якія рэчы па прыродзе? 2. Якім павінна быць наша

---

[1] Ад грэч. *eudaimonia – шчасце*.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

стаўленне да іх? 3. Як мы павінны сябе паводзіць? Адказы Пірона гучаць так: 1. Усе рэчы непастаянныя. 2. Трэба жыць без меркаванняў адносна рэчаў, ні да чаго не схіляючыся (так званая *эпохе*). 3. Пры такім становішчы слушныя толькі апатыя і атараксія.

Другі вядомы прадстаўнік скептыцызму – Секст Эмпірык (канец 2 – пач. 3 стст.). Сабраў і сістэматызаваў выказванні старажытна-грэчаскіх скептыкаў.

Стаіцызм (ад грэч. *stoa – порцік*). Найбольш вядомыя прадстаўнікі: Зянон (334–262 да н. э.), Сенека (1–65), Эпіктэт (50–120), імператар Марк Аўрэлій (121–180).

Сцвярджалі, што мудрэц павінен прытрымлівацца бясстраснасці прыроды (апатыя) і любіць свой рок. Асабістае шчасце разумелі як падпарадкаванне лёсу. Яны лічылі, што разумнага лёс вядзе, а неразумнага цягне. Гэта філасофія абавязку.

Неаплатанізм сістэматызаваў вучэнне Платона і аб’яднаў яго з ідэямі іншых філосафаў, пераважна Арыстоцеля і піфагарэйцаў. Гэтая філасофія была распрацавана Плоцінам (204–269) і завершана Проклам (412–485).

У цэнтры – вучэнне аб іерархічнай пабудове быцця і эманацыі[1], ступенямі якой з’яўляюцца Адзінае – Розум – Душа – Космас – матэрыя. Душа чалавека – частка касмічнай Душы, і чалавек спасцігае Адзінае (альбо Бога) праз экстатычны парыў.

Мова неаплатанізму выкарыстоўвалася ў вучэннях сярэдневяковых філосафаў.

## Літаратура

1 Асмус, В. Ф. Античная философия / В. Ф. Асмус. – М. : Высш. шк., 2003. – 400 с.

2 Лосев, А. Ф. История античной философии в конспективном изложении / А. Ф. Лосев. – М. : ТОО «ЧеРо», 1998. – 190 с.

3 Чанышев, А. Н. Курс лекций по древней философии : учеб. пособие для студ. и аспир. филос. фак-ов и отдел. ун-ов / А. Н. Чанышев. – М. : Высшая школа, 1981. – 373 с.

4 Чанышев, А. Н. Философия Древнего мира : учеб. для вузов / А. Н. Чанышев. – М. : Высш. шк., 2003. – 702 с.

[1] Лац. *emanatio – выцяканне, распаўсюджванне.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

# Тэма 3. Філасофія Сярэдніх вякоў

Пры вывучэнні сярэдневяковай філасофіі трэба ўлічваць наступныя палажэнні:

1. Сярэдневяковая філасофія належыць у асноўным да эпохі феадалізму (V–XV стст.). У аснове культуры гэтага перыяду ляжыць хрысціянства з яго палажэннямі. Асноўным культурным інстытутам у Заходняй Еўропе гэтага перыяду з'яўляецца каталіцкая царква. Амаль выключна ў яе межах развіваецца адукацыя, навука, мастацтва і філасофія.

2. Філасофія сярэднявечча з'яўляецца непасрэдны працягам тэмаў антычных філософаў, перш за ўсё Платона і Арыстоцеля, але ў зусім іншым культурным кантэксце, і таму для яе ўласцівы іншы характар праблематыкі і спосабаў разважання.

3. Сярэдневяковую філасофію, і культуру ў цэлым, не трэба разглядаць як заняпад у параўнанні з антычнасцю. У гэты час багацце антычнай думкі аказалася пераўзыдзеным хрысціянскім светапоглядам. У перыяд сярэднявечча дзейнічалі такія выдатныя філосафы, як: Аўрэлій Аўгусцін (354–430), Ян Скот Эрыўгена (810–877), Ансельм Кентэрберыйскі (1033–1109), Ібн Рушд (1126–1198), Абеляр (1079–1142), Роджэр Бэкон (1214–1292), Фама Аквінскі (1225–1274), Дунс Скот (1266–1308), Уільям Акам (1285–1349) і іншыя.

Асноўныя рысы заходняй сярэдневяковай філасофіі абумоўлены яе сувяззю з хрысціянствам:

1. Тэацэнтрызм (ад лац. *theos – бог*). Сцвярджаецца, што ў цэнтры свету знаходзіцца Бог як Абсалютнае Быццё. Тэацэнтрызм адпавядае імкненню антычнай філасофіі вывесці космас з адзінай асновы і будаваць мысленне ў адпаведнасці з адзіным лагічным прынцыпам.

2. Крэацыянізм (ад лац. *creatio – стварэнне*) – зыходзяць з таго, што Бог усё стварыў. З гэтага выводзяцца вельмі важныя філасофскія палажэнні: 1. Свет мае пачатак. 2. Яго стварэнне мае сваю паслядоўнасць. 3. Працэс стварэнне свету апісваецца рацыянальна, а не праз вобразы, таму ён можа быць падвергнуты аналізу і крытыцы. 4. Свет мае сваю каштоўнасць. 5. Свет створаны ў адпаведнасці з Божым розумам, і таму можа быць рацыянальна спасцігнуты.

3. Персаналізм (ад лац. *persona – асоба*) – значна больш глыбокае, чым у антычнасці, разуменне асобы, бо кожны чалавек створаны па вобразу і падабенству Бога, значыць, мае сваю каштоўнасць. На гэтай аснове абвяшчаецца прынцыповая роўнасць паміж людзьмі, што паўплывала на далейшыя сацыяльныя тэорыі.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

4. Правідэнцыялізм (ад лац. *providentia – прадбачанне*) – тлумачэнне гістарычнага працэсу як ажыццяўленне Божай задумы. Найбольш яскрава выразіўся ў творы Аўгустына “Аб градзе Божым”. Трэба звярнуць увагу на тое, што ў гэты перыяд гісторыя набывае дзве такія важныя рысы, як сэнс і лінейны характар.

Вылучаюць наступныя этапы гісторыі сярэдневяковай філасофіі:

1. <u>Патрыстыка</u> (ад лац. *pater – айцец*) – сукупнасць вучэнняў найбольш значных хрысціянскіх мысліўцаў II–VIII стст. – “Айцоў Царквы”. У ёй ёсць тры этапы: 1. Ранняя альбо апалагетыка (II ст.) – адбывалася адстойванне ісцінасці хрысціянскага веравучэння ва ўмовах крытыкі з пазіцый антычнай культуры. 2. Сталая (III–V стст.) – фарміруюцца асноўныя палажэнні хрысціянскага веравучэння. 3. Позняя (V–VIII стст.) – адбываецца сістэматызацыя хрысціянскага веравучэння. Палажэнні патрыстыкі былі сфармуляваны на мове, запазычанай з філасофіі неаплатанізму: дагмат аб Троіцы, аб дзвюх прыродах Хрыста, вучэнне аб пераваге душы над целам.

2. <u>Схаластыка</u> (ад лац. *schola – школа*) – кірунак у заходнееўрапейскай сярэдневяковай філасофіі, для якога былі характэрны імкненне рацыянальна абгрунтаваць хрысціянскае веравучэнне і асаблівы інтарэс да лагічнай праблематыкі. Вылучаюць раннюю (IX–XII стст.), высокую (XIII – пач. XIV стст.) і познюю (XIV–XV стст.) схаластыку.

Да асноўных праблем сярэдневяковай філасофіі адносяцца:

1. Праблема суаднясення веры і розуму. Пры яе вырашэнні вылучыліся тры падыходы: 1. Вера супрацьстаіць розуму. У афарыстычнай форме гэтая пазіцыя была выражана ў палажэнні “*credo quia absurdum*” (“*веру, бо абсурдна*”) Цертуліяна. 2. Вера з’яўляецца асновай розуму. Выражана ў формуле “*credo ut intelligam*” (“*веру, каб разумець*”). Уласціва большасці сярэдневяковых філосафаў. 3. Вера абапіраецца на розум. Выражана ў формуле Абеляра *intelligo ut credam* (“*разумею, каб верыць*”). У цэлым жа, згодна з сярэдневяковай філасофіяй, розум і вера з’яўляюцца аўтаномнымі і валодаюць аднолькавым статусам. Праблема гарманічнага сінтэзу розуму і веры прысутнічае ў сістэмах Ансельма Кентэрберыйскага, Альберта Вялікага, Фамы Аквінскага.

2. Праблема прыроды ўніверсалій (агульных паняццяў). Па гэтым пытанні вылучыліся дзве пазіцыі: <u>рэалізм</u> (ад лац. *realis – сапраўдны*) і <u>наміналізм</u> (ад лац. *nomen – імя*). Рэалісты сцвярджалі, што ўніверсаліі існуюць ідэальна, да рэчаў, альбо, што яны рэальныя, але існуюць у асобных рэчах (умераны рэалізм). Наміналізм адмаўляў рэальнае існаванне ўніверсалій, лічачы іх толькі імёнамі (крайні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф.СКОРИНЫ

наміналізм), альбо ўтварэннямі думкі, якія не з’яўляюцца адвольнымі імёнамі і існуюць у розуме чалавека як вынік абстрагіруючай дзейнасці (умераны наміналізм альбо канцэптуалізм (ад. лац. *conceptus – паняцце*)).

Рэалізм існаваў у ранняй схаластыцы. У высокай ён змяніўся ўмераным рэалізмам. На пазіцыях канцэптуалізму стаяў Абеляр. У позняй схаластыцы на першае месца выйшлі наміналісты. Дыскусія наміналістаў і рэалістаў удасканальвала логіку, садзейнічала дасягненню навуковай строгасці, паклала аснову тэорыі мностваў і матэматычнай логіцы.

## Літаратура


1 Коплстон, Ф. Ч. История средневековой философии / Ф. Ч. Коплстон. – М. : Энигма, 1997. – 512 с.

2 Майоров, Г. Г. Формирование средневековой философии / Г. Г. Майоров. – М. : Мысль, 1979. – 431 с.

3 Чанышев, А. Н. Курс лекций по древней и средневековой философии / А. Н. Чанышев. – М. : Высшая школа, 1991. – 512 с.

4 Штекль, А. История средневековой философии / А. Штекль. – М. : URSS, 1996. – 312 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Тэма 4. Філасофія Адраджэння

Пры вывучэнні філасофіі Адраджэння трэба зыходзіць з дзвюх яго ўзаемадапаўняльных характарыстык: 1. Гэта – пераходны этап ад Сярэднявечча да Новага часу. 2. Яно адрозніваецца і ад таго, і ад другога. Філасофія Адраджэння мае самастойны і арыгінальны характар.

Звычайна Адраджэнне характарызуецца праз змены, якія пачалі адбывацца з пачатку XIV ст. у розных галінах еўрапейская культуры Заходняй Еўропы. Падкрэсліваецца яго адрозненне ад сярэдніх вякоў.

Трэба зыходзіць з таго, што ў гэты перыяд адбыўся сапраўдны выбух у культуры. Найбольш яскрава ён праявіўся ў мастацтве. У галіне філасофіі ў гэты час працавалі такія мысліўцы як: Лявон Батыста Альберці (1404–1472), Ларэнца Вала (1407–1457), Марсіліа Фічына (1433–1499), Джавані Піка дэла Мірандола (1463–1494), Мікола Макіявелі (1469–1527), Эразм Ратэрдамскі (1469–1536),

Мішэль Мантэнь (1533–1592), Томас Мор (1478–1535), Мікалай Кузанскі (1401–1464), Тамаза Кампанела (1568–1639) і шмат іншых.

Спецыфіка гэтага перыяду адлюстравана ў самой яго назве: *Адраджэнне* (франц. *Renaissance*). Адраджаліся элементы антычнай культуры, але адбывалася гэта на хрысціянскай аснове.

Асноўнымі рысамі Адраджэння з’яўляюцца:

1. Інтарэс да антычнай культуры. У філасофіі – да Платона, які супрацьпастаўляўся Арыстоцелю, на якім грунтавалася схаластыка. У той жа час адной з галоўных асаблівасцяў філасофіі гэтага перыяду з’яўляецца тое, што ў ёй адбываецца спецыфічная мадыфікацыя арыстоцелізму, платанізму, эпікурэізму, стаіцызму, скептыцызму і іншых антычных філасофскіх школ.

2. Інтарэс да чалавека. Вельмі часта філасофія Адраджэння пазначаецца як гуманізм (ад лац. *humanus* – *чалавечы, чалавечны*). Трэба ўлічваць, што ў перыяд Адражэння гэтае слова мела значэнне, адрознае ад сучаснага. Гуманістамі (*humanista*) называлі выкладчыкаў дысцыплін, якія займаліся пазнаннем чалавека: гісторыі, літаратуры, філасофіі і рыторыкі, па аналогіі са словамі *законнік* (*legista*), *мастак* (*artista*). У далейшым так сталі называць большасць дзеячоў эпохі Адраджэння. Галоўнай асаблівасцю рэнесанснай культуры быў пераход ад тэацэнтрычнага да антрапацэнтрычнага разумення свету.

3. Індывідуалізм. У Сярэднявеччы чалавек успрымаў сябе толькі як частку нейкага цэлага: саслоўя, групы сям’і. У Адраджэнні чалавек успрымае сябе адасоблена, у сваёй унікальнасці. Націск робіцца на яго самарэалізацыю.

4. Інтарэс да прыроды. Для філосафаў Адраджэння быў характэрны пантэізм (ад грэч. *pan* – *усё* і *theos* – *Бог*) – вучэнне, у якім атаясамліваўся Бог і свет. Пантэістычныя матывы моцныя ў філасофіі М. Кузанскага. Таксама характэрным было імкненне даследаваць прыроду. Пераварот у светапоглядзе таго часу ажыццявіў М. Капернік, які прапанаваў геліяцэнтрычную мадэль сусвету. Адбылася капернікіянская рэвалюцыя.

5. Жаданне рэлігійнага абнаўлення. Але змены ў рэлігіі адбыліся за межамі Італіі. Англійскі філасаф Э. Ратэрдамскі выкарыстоўваў ідэі гуманізму для рэформы царквы.

Своеасаблівым працягам і адмаўленнем ідэй Адраджэння з’яўляецца Рэфармацыя, якая пачалася ў Германіі з выступлення Марціна Лютэра (1483–1546) і прывяла да ўзнікнення пратэстанцкай царквы. Найбольш вядомымі дзеячамі Рэфармацыі, апроч Лютэра, з’яўляюцца Томас Мюнцэр (1490–1525), Уільрых Цвінглі (1484–1531) і Жан Кальвін (1509–1564).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

6. Імкненне да пераўтварэння грамадства. У перыяд Адраджэння былі створаны вядомыя сацыяльна-палітычныя вучэнні ў творах Томаса Мора “Утопія” і Тамаза Кампанэлы “Горад Сонца”. Яны імкнуліся прапанаваць праект справядлівага ладу. Фактычна яны стварылі праект таталітарнага грамадства, якое атрымала сваё ўвасабленне ў XX ст.

Відавочнай праявай крызісу гуманізму Рэнесансу з’яўляецца знакаміты твор Нікола Макіявелі “Князь”, у якім была выказана ідэя аўтаноміі ўлады ад маралі. Макіявелі лічыў, што чалавек сам па сабе ні добры, ні дрэнны, але, хутчэй, схільны да таго, каб быць дрэнным. Палітык павінен гэта ўлічваць і адпаведным чынам дзейнічаць. Безумоўна, такі падыход рэзка супярэчыць устаноўкам гуманізму.

## Літаратура


1 Буркхардт, Я. Культура Италии в эпоху Возрождения / Я. Буркхардт. – М. : Юристъ, 1996. – 591 с.

2 Бэрк, П. Рэнесанс / П. Бэрк. – Мн. : Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, 1997. – 96 с.

3 Горфункель, А. Х. Философия эпохи Возрождения / А. Х. Горфункель. – М. : Высшая школа, 1980. – 368 с.

4 Лосев, А. Ф. Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М. : Мысль, 1982. – 623 с.

5 Соколов, В. В. Средневековая философия / В. В. Соколов. – М.: Высшая школа, 1996. – 448 с.


# Тэма 5. Філасофія Новага часу

Гэта перыяд, калі фарміруюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця еўрапейскай культуры. Узнікае класічная навука, творцамі якой з’яўляюцца Галілеа Галілей (1564–1642), Іаган Кеплер (1571–1630) і Ісаак Ньютон (1642–1727).

У цэнтр філасофскіх разважанняў уваходзіць праблема пазнання. Ставіцца пытанне: якім чынам мы дасягаем ісціных ведаў? Праз адказ на яго фарміруюцца два асноўныя філасофскія накірункі Новага часу: рацыяналізм (ад лац. *ratio* – розум), які сцвярджаў, што ісціныя веды дае розум, і эмпірызм (ад грэч. *empeiria* – вопыт), які зыходзіў з таго, што адзінай крыніцай ісціных ведаў з’яўляецца вопыт.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Пры вывучэнні гэтых кірункаў неабходна звярнуць увагу на спецыфіку іх спосабаў разважання і аргументацыі. Цікавым з'яўляецца і той факт, што на пазіцыях рацыяналізму стаялі філосафы з кантынентальнай Еўропы, а на пазіцыях эмпірызму – з Англіі.

Заснавальнікам рацыяналізму з'яўляецца французскі філосаф Рэнэ Дэкарт (1596–1650). Трэба памятаць, што ён таксама быў матэматыкам і свае разважанні будаваў на прыкладзе і матэрыяле гэтай навукі.

Дэкарт шукае фундамент, на якім можна пабудаваць веды. Для гэтага ён выкарыстоўвае прынцып метадычнага сумнення. Мы можам сумнявацца ў любых ведах, атрыманах праз пачуцці, бо яны часта нас падманваюць. У чым я сумнявацца не магу? У тым, што я сумняваюся. Сам факт мыслення сведчыць пра існаванне таго, хто мысліць: "cogito, ergo sum" ("мыслю – значыць, існую"). Выснова, якую робіць з гэтага Дэкарт, мае радыкальны характар: ісціныя веды гэта тыя, якія наш розум успрымае як ясныя і відавочныя.

Дэкарт распрацаваў правілы для кіраўніцтва розумам, якія, на яго думку, павінны прывесці да ісціных ведаў.

1. Правіла відавочнасці – зыходзіць толькі з тых палажэнняў, якія прадстаўляюцца розуму настолькі ясна і выразна, што ў іх не можа быць ніякіх сумненняў. 2. Правіла аналізу – дзяліць кожную праблему на столькі частак, колькі магчыма і неабходна для найлепшага яе вырашэння. 3. Правіла сінтэзу – будаваць свае думкі ў акрэсленым парадку, пачынаючы з найбольш простых прадметаў, і паступова ісці да найбольш складаных. 4. Правіла паступовасці – старанна пералічваць усе крокі разважанняў, каб быць упэўненым, што нічога не прапушчана.

Іншымі вядомымі прадстаўнікамі рацыяналізму з'яўляюцца Мікалай Мальбранш (1638–1715), Блез Паскаль (1626–1662), Бенедыкт Спіноза (1632–1677) і Готфрыд Вільгельм Лейбніц (1646–1716).

Заснавальнікам эмпірызму з'яўляецца Фрэнсіс Бэкан (1561–1625).

Яму належыць знакамітая фраза: "Веды – сіла". Трэба падкрэсліць, што гэта было прынцыпова новае палажэнне: да гэтага веды насілі сузіральны характар і служылі для ўспрымання агульнай гармоніі свету. Бэкон падкрэсліваў практычны сэнс пазнання.

Закладзеная Бэканам праграма эмпірызму зыходзіць з таго відавочнага для штодзённага светапогляду факта, што аснову нашых ведаў аб рэчаіснасці складаюць вопытныя (эмпірычныя) дадзеныя. Ёсць незалежныя ад нас прадметы, якія мы ўспрымаем. Праграма Бэкана заключалася ў тым, каб ачысціць розум ад усяго, што перашкаджае яму непасрэдна ўспрымаць рэчаіснасць. Гэтыя перашкоды Бэкан называе "ідаламі", якіх налічвае чатыры:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

1. Ідалы роду (idola tribus) – памылковыя погляды, уласцівыя ўсім людзям, паколькі вынікаюць з прыроды чалавека і абумоўлены недасканаласцю пачуццёвага ўспрымання. 2. Ідалы пячэры (idola specus) – індывідуальныя памылковыя думкі, якія ўзнікаюць таму, што кожны чалавек бачыць свет са сваёй абмежаванай перспектывы. 3. Ідалы рынку (idola fori) – узнікаюць з недакладнасці нашай мовы, якая не заўсёды ясна абазначае прадметы. 4. Ідалы тэатру (idola theatri) – абумоўлены, па-першае, прыпісваннем вобразам рэальнага існавання, па-другое, верай у несапраўдныя аўтарытэты.

Бэкан вылучыў два спосабы пазбаўлення ад ідалаў:

1. Эксперымент, які з’яўляецца мэтанакіраваным назіраннем аб’екта ў спецыяльна створаных умовах, дзякуючы чаму пераадольваецца суб’ектыўнасць успрымання. 2. Індукцыя – паслядоўны пераход ад дадзеных вопыту да агульных суджэнняў. Эксперымент пераадольвае заблуджэнні пачуццяў (ідалы роду і пячэры), а індукцыя – заблуджэнні розуму (ідалы рынку і тэатра).

Наступны вядомы прадстаўнік эмпірызму – англійскі філосаф Джон Лок (1632–1704). Менавіта ён стварыў цэласную сістэму эмпірычнай філасофіі. Яму належыць выказванне: “Няма нічога ў розуме, чаго папярэдне не было б у пачуццях”. Свядомасць чалавека ён параўноўваў з чыстай дошкай (tabula rasa), на якой дзякуючы пачуццям запісваюцца веды.

Лок з’яўляецца адным з тэарэтыкаў лібералізму[1]. Ён лічыў, што дзяржава ўзнікае ў выніку дамовы паміж грамадзянамі, якія аб’ядноўваюцца, каб сумесна абараняць свае натуральныя правы. Выступаў за раздзяленне ўладаў.

Наступны прадстаўнік эпірызму, Томас Гобс (1588–1679), вядомы сваім творам “Левіяфан”, у якім сцвярджаў, што дяржава ўзнікла з неабходнасці пераадолець эгаістычную прыроду чалавека. У натуральнам стане існуе вайна ўсіх супраць усіх, кожны кіруецца сваімі інтарэсамі, і чалавек чалавеку – воўк. Для сумеснага жыцця людзі заключаюць паміж сабой дамову і перадаюць свае правы дзяржаве. Дзяржава – гэта галоўны выхаваўчы фактар цывілізацыі, яе ўлада мае абсалютны характар.

У творах Дэвіда Юма (1711–1776) і Джорджа Берклі (1685–1753) эмпірызм паказаў сваю абмежаванасць. Юм зыходзіў з трактоўкі пачуццёвага вопыту як патоку ўражанняў, прычыны якіх з’яўляюцца неспасцігальнымі. Таму ён адмаўляў паняцце субстанцыі і аб’ектыўны

[1] Лібералізм (ад лац. *liberalis* – свабодны) – грамадска-палітычны рух, які абвясціў прынцып свабод чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

характар прычыннасці, бо мы не атрымліваем іх з пачуццяў. Берклі сцвярджаў, што знешні свет не існуе незалежна ад яго ўспрымання, таму быць – гэта значыць быць ўспрымаемым (*esse est percipi*).

Філасофія эмпірызму аказала значны ўплыў на фарміраванне ідэй французскага Асветніцтва, але максімальнага развіцця дасягнула ў XX ст. у метадалогіі пазітывізму.

## Літаратура


1 Соколов, В. В. Введение в классическую философию / В. В. Соколов. – М. : Высшая школа, 1999. – 448 с.

2 Кирсанов, В. С. Научная революция XVII века / В. С. Кирсанов. – М. : Наука, 1987. – 342 с.

3 Хесле, В. Гении философии Нового времени / В. Хесли. – М. : Наука, 1992. – 205 с.

4 Шашкевич, П. Д. Эмпиризм и рационализм в философии Нового времени / П. Д. Шашкевич. – М. : Мысль, 1976. – 314 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Тэма 6. Філасофія Асветніцтва

Асветніцтва – (франц. *Lumière*, ням. *Aufklärung*, англ. *Enlightenment*) – асаблівы тып светапогляду і філасофіі, характэрны для культурнага жыцця Еўропы ў XVIII ст. Сама назва паходзіць ад таго, што яго прадстаўнікі лічылі асноўным сродкам развіцця грамадства распаўсюджванне ведаў.

Трэба ўлічваць, што Асветніцтва – гэта міжнародны рух, які ахапіў шмат якія краіны. Але у Францыі Асветніцтва праявілася з класічнай выразнасцю, паслядоўнасцю і радыкальнасцю. Тут знаходзіліся яго асноўныя прадстаўнікі: Дэні Дзідро (1713–1784), Жан Лярон Д'Аламбер (1717–1783), Вальтэр (1694–1778), Жульен Офрэ дэ Ламетры (1709–1751), Шарль Луі Мантэск'е (1689–1755), Жан Жак Русо (1712–1778), Клод Адрыян Гельвецый (1715–1771), Поль Анры Гольбах (1723–1789), Эцьен Бано дэ Кандзільяк (1715–1780).

Асноўныя рысы Асветніцтва:

1. Упэўненасць у тым, што крыніцай усіх праблем з'яўляецца непісьменства. Таму яно павінна быць пераадолена.

2. Грамадства павінна быць перабудавана на аснове розуму. Розум у ідэалогіі Асветніцтва: а) з'яўляецца адзіным, універсальным і

агульным для ўсіх людзей і часоў; б) займае месца вышэйшай інстанцыі крытычнага аналізу.

3. Палажэнні розуму павінны быць пабудаваны на абагульненні вопыту. Рацыянальнасць Асветніцтва з'яўляецца сінтэзам англійскага эмпірызму і картэзіянскага рацыяналізму. Узорам з'яўляецца для іх фізіка Ньютона, пабудаваная на вопыце. Таму асветнікі выступалі супраць метафізічных сістэм. Механістычнае светаразуменне, распрацаванае на падставе паняццяў ньютонаўскага прыродазнаўства, яны імкнуліся ўжыць таксама і для тлумачэння паводзін людзей і грамадства.

4. Вельмі важнае значэнне надаецца канцэпцыі натуральнага парадку, які можа быць спасцігнуты розумам. Згодна з асветнікамі, сацыяльныя адносіны павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з прыродай чалавека. Вельмі вялікае месца ў іх разважаннях займаюць паняцці "натуральная рэлігія", "натуральная маральнасць", "натуральнае права".

5. Крытычнае стаўленне да існуючай абсалютнай манархіі, сістэмы саслоўных прывілеяў, каталіцкай царквы. Наогул для большасці асветнікаў хрысціянская рэлігія і царква з'яўляюцца галоўнай перашкодай на шляху розуму і прагрэсу. Вядомы заклік "патрыярха асветнікаў" Вальтэра – "Раздавіце гадзіну!". Але ў той жа час рэлігія лічылася патрэбнай для кіравання масамі, абгрунтавання для іх неабходнасці маральных паводзін. Таму ж Вальтэру належыць фраза "Калі б Бога не існавала, яго трэба было б прыдумаць". Частка асветнікаў стаялі на пазіцыях атэізму[1] (Гольбах, Дзідро, Ламетры), частка – дэізму[2] (Вальтэр, Мантэск'е). Але ўсе яны былі антыклерыкаламі[3].

6. Вера ў прагрэс. Асветніцтва – аптымістычная філасофія буржуазіі, якая ў гэтыя часы была поўная сіл і імкнення да развіцця. Вальтэр любіў казаць: "Аднойчы ўсё зробіцца лепш". Іншай была пазіцыя Русо. Згодна з яго поглядамі, развіццё навукі і мастацтва вядзе да маральнага заняпаду, бо фарміруе ў людзей штучныя патрэбы.

7. У адрозненне ад філасофіі XVII ст. у перыяд Асветніцтва не было створана фундаментальных традыцый, падобна эмпірызму ці рацыяналізму. Рух філасофскай думкі ідзе ў гэты перыяд не "ўглыб", але "ўшырыню" і накіраваны не столькі на стварэнне новых філасофскіх ідэй, колькі на прапаганду ўжо існуючых. Яго

---

[1] Атэізм (ад грэч. *atheos – бязбожны*) – адмаўленне рэлігіі.

[2] Дэізм (ад лац. *deus – бог*) – вучэнне, якое прызнае Бога як Стварыцеля, але адмаўляе яго ўмяшальніцтва ў далейшае развіццё свету.

[3] Антыклерыкалізм – рух накіраваны супраць кіруючай ролі рэлігіі ў грамадстве.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

прадстаўнікі працавалі не толькі ў філасофіі, але і ў літаратуры. Іншымі сродкамі, якія асветнікі ўжывалі для распаўсюджвання сваіх ідэй, былі акадэміі, масонскія ложы, салоны, лісты, нарысы, і нарэшцэ, знакамітая “Энцыклапедыя альбо тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў” (1751–1772).

Асветніцтва аказала значны ўплыў на далейшую культуру і сацыяльную гісторыю Еўропы. Самым важным яе вынікам з’явілася ідэйная падрыхтоўка Французскай рэвалюцыі 1789–1799 гадоў.

## Літаратура

1 Кузнецов, В. Н. Западноевропейская философия XVIII века / В. Н. Кузнецов, Б. В. Мееровский, А. Ф. Грязнов. – М. : Высшая школа, 1986. – 400 с.

2 Длугач, Т. Б. Подвиг здравого смысла, или Рождение идеи суверенной личности (Гольбах, Гельвеций, Руссо) / Т. Б. Длугач. – М. : Наука, 1995 – 221 с.

3 Манфрез, А. З. Три портрета времен французской революции / А. З. Манфрез. – М. : Мысль, 1989. – 223 с.

4 Момджнян, Х. Н. Французское просвещение XVIII века: очерки / Х. Н. Момджнян. – М. : Мысль, 1983. – 447 с.

5 Французское просвещение и революция / М. А. Кисель [и др.]; отв. ред. М. А. Кисель. – АН СССР, Институт философии. – М. : Наука, 1989. – 272 с.

# Тэма 7. Нямецкая класічная філасофія

Нямецкая класічная філасофія – гэта своеасаблівая мяжа ў развіцці філасофіі, пасля яе пачынаецца пошук іншых спосабаў філасофствавання.

Вызначальнай рысай, праз якую можна зразумець спецыфіку гэтай філасофіі, з’яўляецца выяўленне і падкрэсліванне актыўнасці суб’екта.

Да нямецкай класічнай філасофіі традыцыйна адносяць Імануіла Канта (1724–1804), Іагана Готліба Фіхтэ (1762–1814), Фрыдрыха Вільгельма Шэлінга (1775–1854), Георга Вільгельма Фрыдрыха Гегеля (1770–1830) і Людвіга Феербаха (1804–1872). Вучэнне кожнага з гэтых мысліўцаў уяўляе сабой складаную і разгалінаваную сістэму. Мы схематычна выкладзем ідэі Канта, Гегеля і Феербаха.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Трэба ўлічваць, што дзейнасць Канта падзяляецца на два перыяды: дакрытычны (1746–1770) і крытычны (1770–1797). Галоўная праца першага перыяду “Усеагульная натуральная гісторыя і тэорыя неба” (1755), дзе была сфармулявана знакамітая тэорыя Канта-Лапласа, аб паходжанні Сусвету. У крытычны перыяд былі напісаны “Крытыка чыстага розуму” (1783), “Крытыка практычнага розуму” (1791) і “Крытыка здольнасці суджэння” (1798), стварэнне якіх сам Кант лічыў “капернікіянскім пераваротам у філасофіі”. Яго сутнасць у тым, што не наша пазнанне адпавядае свету аб’ектаў, а, наадварот, свет аб’ектаў будуецца ў адпаведнасці з формамі нашага пазнання.

Кант падзяляў веды на апастэрыёрныя (ад лац. *aposteriori – з наступнага*), якія паходзяць з вопыту, і апрыёрныя (ад лац. *apriori – з папярэдняга*), якія папярэднічаюць вопыту. Усеагульным і неабходным характарам валодаюць апрыёрныя веды, яны з’яўляюцца ўмовай апастэрыёрных.

Кант вылучае дзве формы апрыёрнага пачуццёвага пазнання: прастору і час. Веды аб іх мы атрымліваем не з вопыту, але яны з’яўляюцца ўмовамі пачуццёвага вопыту.

Апрыёрнымі формамі разумовага пазнання з’яўляюцца катэгорыі: адзінства, мноства, цэласнасць, рэчаіснасць, адмаўленне, абмежаванне, субстанцыя, прычыннасць, магчымасць, існаванне, неабходнасць і г. д. Праз іх афармляецца наш пачуццёвы вопыт.

Кант раздзяляў “рэчы ў сабе”, якія з’яўляюцца крыніцай вопыту, але пра якія мы нічога не можам сказаць і “рэчы для нас”, альбо з’явы, якія фарміруюцца праз формы нашага пазнання. Мы пазнаем не рэчы ў сабе, але з’явы.

Згодна з Кантам, пазнанне абмежавана вопытам. Але чалавек заўсёды імкнецца пры дапамозе розума выйсці за межы вопыта. Кант крытыкуе чысты розум і вылучае тры яго памылковыя ідэі: 1. Аб існаванні душы (псіхалагічнае ідэя). 2. Аб існаванні сусветнай душы (касмалагічная ідэя). 3. Аб існаванні Бога (тэалагічная ідэя). Даказаць іх немагчыма.

Аднак гэтыя ідэі з’яўляюцца пастулатамі “практычнага розуму” і неабходнымі прадумовамі маральнасці. Этыка Канта грунтуецца на катэгарычным імператыве (ад лац. *imperativus – загадны*) – безумоўным прынцыпе паводзін: “паводзь сябе так, каб прынцып тваіх паводзін мог стаць усеагульным законам”.

Філасофія Гегеля – гэта канцэнтраванае выражэнне рацыяналізму Новага часу. Яго асноўнымі творамі з’яўляюцца: «Фенаменалогія духа» (1807), «Навука логікі» (1812–1816), «Энцыклапедыя філасофскіх навук» (1817).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Пры вывучэнні яго філасофіі трэба ўлічваць, што яна ўяўляе сабой адну з самых разгалінаваных і складаных для разумення філасофскіх сістэм. Схематычна яе можна выкласці праз тры палажэнні: 1. Рэчаіснасць ёсць не субстанцыя, але суб'ект, бясконцы Дух. 2. Сутнасць Духа – у яго развіцці праз супярэчныя моманты. 3. Асаблівасцю развіцця з'яўляецца тое, што Гегель назваў спекулятыўным элементам, калі адбываецца сінтэз супярэчнасцяў.

У сваім развіцці Дух праходзіць тры моманты: 1) быццё-у-сабе; 2) іншабыццё, быццё-для другога; 3) канчатковае быццё-у-сабе-і-для-сябе. Гэтыя тры моманты прынята пазначаць у спрошчанай форме як "тэзіс", "антытэзіс", "сінтэз". Адсюль вынікае падзел Гегелеўскай філасофіі на галіны: 1) логіку (быццё, сутнасць, паняцце); 2) філасофію прыроды (механіка, фізіка, арганічная фізіка); 3) філасофію Духа, куды ўваходзяць суб'ектыўны Дух (антрапалогія, фенаменалогія, псіхалогія), аб'ектыўны Дух (права, мараль, звычаі), Абсалютны Дух (мастацтва, рэлігія, філасофія).

Л. Феербах стварыў канцэпцыю антрапалагічнага матэрыялізму. Асноўная яго праца "Сутнасць хрысціянства" (1841). Яго ідэі склаліся ў палеміцы з Гегелем. Феербах, вядомы перш за ўсё сваёй крытыкай рэлігіі, у філасофіі Гегеля бачыў спробу пабудаваць рацыянальную тэалогію. Лічыў, што вышэйшым прадметам філасофіі з'яўляецца чалавек з яго шматлікімі перажываннямі. Рэлігія адлюстроўвае рэальныя чалавечыя імкненні да шчасця і дасканаласці, але ў адчужанай форме. Прапаноўваў стварыць "рэлігію любві", у якой месца Бога зойме чалавек.

Феербах аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне філасофіі марксізму.

## Літаратура


1 Асмус, В. Ф. Кант Иммануил 1724–1974. К двухсотпятидесятилетию со дня рождения / В. Ф. Асмус. – М. : Наука, 1973. – 534 с.

2 Гулыга, А. В. Немецкая классическая философия / А. В. Гулыга. 2-е изд. – М. : Рольф, 2001. – 416 с.

3 Кузнецов, В. И. Немецкая классическая философия второй половины XVI – начала XIX века : учеб. пособие для ун-тов / В. Н. Кузнецов. – М. : Высшая школа, 1989. – 480 с.

4 Румянцева, Т. Г. Немецкая трансцендентально-критическая философия (середина XVIII – первая треть XIX) : курс лекций / Т. Г. Румянцева. – Минск : БГУ, 2008. – 171 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

# Тэма 8. Філасофія марксізму

Пры вывучэнні філасофіі марксізму трэба ўлічваць дзве абставіны:

1. Марксізм у выглядзе марксізму-ленінізму доўгі час з’яўляўся афіцыйнай савецкай ідэалогіяй. Пасля распаду Савецкага Саюзу ён падвергся інтэнсіўнай крытыцы. Але ў той жа час, марксісцкія схемы разважанняў і да гэтага часу выкарыстоўваюцца шмат у якіх падручніках і штодзённым жыцці. Таму трэба ведаць, што такое марксізм, каб мець магчымасць супаставіць яго з іншымі вучэннямі.

2. Марксізм уяўляе сабой адну з найбольш глыбокіх сацыяльных тэорый. Прапанаваны ў ім метад аналізу грамадства плённы і зараз. Калі казаць надзвычай спрошчана, гэты метад зводзіцца да выяўлення інтарэсаў (перш за ўсё эканамічных) тых ці іншых сацыяльных груп.

Раней класікамі марксізму лічыліся Карл Маркс (1818–1883), Фрыдрых Энгельс (1820–1895) і Уладзімір Ільіч Ленін (1870–1924). Зараз, як правіла, абмяжоўваюцца толькі Марксам.

Асаблівасці марксісцкага светапогляду:

1. Мае дзейсны характар. Неад’емным яго кампанентам з’яўляецца імкненнеператварыць свет. Марксізм – гэта не толькі філасофскае вучэнне, але і палітычная праграма, якая ўвасобілася ў дзейнасці сацыялістычных і камуністычных партый.

2. Уяўляе сабой цэласную сістэму, куды ўваходзяць: марксісцкая палітэканомія, марксісцкая філасофія (дыялектычны матэрыялізм) і навуковы камунізм. Адпаведна ў якасці крыніц, з якіх узнік марксізм, называюць англійскую палітэканомію, нямецкую класічную філасофію і французскі матэрыялізм, а таксама французскі утапічны сацыялізм.

3. Філасофія марксізму сфарміравалася ў выніку крытычнага пераасэнсавання і творчага сінтэзу ідэалістычнай дыялектыкі Гегеля і антрапалагічнага матэрыялізму Феербаха. Ад першага была запазычана ідэя развіцця ў адпаведнасці з аб’ектыўнымі законамі. Ад другога – палажэнне аб тым, што свет разглядаецца праз прызму чалавечых патрэб і, наадварот, – тлумачэнне чалавека патрабуе тлумачэння свету.

4. Матэрыялістычнае разуменне гісторыі. “Не свядомасць людзей вызначае іх быццё, але, наадварот, іх грамадскае быццё вызначае іх свядомасць” – найбольш дакладнае акрэсленне матэрыялізму Маркса. Пад грамадскім быццём у марксізме разумеецца сукупнасць вытворчых адносін. Іх матэрыяльнасць заключаецца ў тым, што яны складваюцца і развіваюцца па сваіх іманентных законах, існуюць аб’ектыўна, незалежна ад таго, асэнсоўваюць іх людзі, ці не.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

5. Згодна з марксізмам рухавіком грамадскага прагрэсу выступаюць супярэчнасці паміж новымі вытворчымі сіламі і існуючымі вытворчымі ўзаемаадносінамі. Для ўсіх фармацый, за выключэннем першабытна-абшчыннай і камуністычнай, гэта супярэчнасць праяўляецца ў форме класавай барацьбы, якая прыводзіць да рэвалюцыі.

6. Філасофіяй марксізму з'яўляецца дыялектычны матэрыялізм. Згодна з ім адзінай фундаментальнай асновай свету з'яўляецца матэрыя. Усё – альбо матэрыя, альбо ўзнікае з яе. Яна – вечная і бясконцая ў прасторы і часе. Валодае здольнасцю да самазмянення і самаразвіцця, што ажыццяўляецца дзякуючы ўзаемадзеянню ўласцівых ёй дыялектычных супрацьлегласцей.

У канцы XIX ст. сярод найбольш аўтарытэтных марксістаў Германіі назіраецца адыход ад артадаксальнага вучэння. Дапускаецца філасофскі плюралізм, які сцвярджае, што галоўнае – вызваленне пралетарыяту, і неістотна, пры дапамозе якіх філасофскіх поглядаў, ідэалістычных альбо матэрыялістычных, яно будзе абгрунтавана.

Гэтая тэндэнцыя сустрэла рашучы адпор з боку Леніна ў яго галоўнай філасофскай працы "Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм" (1909). Менавіта яе палажэнні з'явіліся асновай марксісцка-ленінскай філасофіі, якая ў Савецкім Саюзе мела характар афіцыйнай ідэалогіі.

У Заходняй Еўропе сфарміраваўся неамарксізм. Для яго характэрна крытычнае стаўленне як да капіталізму, так і да таго ладу, які пад назвай сацыялізму быў усталяваны ў Савецкім Саюзе. У неамарксізме метадалогія Маркса ўжывалася для аналізу грамадства XX ст. Яго прадстаўнікамі з'яўляюцца: Дзьёрдзь Лукач (1885–1971), Антоніа Грамшы (1891–1937), Тэадор Адорна (1903–1969), Юрген Хабермас (нар. 1929), Вільгельм Райх (1897–1957), Эрых Фром (1900–1980), Герберт Маркузэ (1898–1979), Луі Альцюсер (1919–1990) і інш.

Спрэчкі наконт тых ці іншых палажэнняў марксізму ідуць і зараз. Марксізм – філасофскае вучэнне, якое аказала каласальны ўплыў на гісторыю XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

## Літаратура

1 Андерсон, П. Размышления о западном марксизме / П. Андерсон. – М. : Интер-Версо, 1991 – 272 с.

2 Диалектический и исторический материализм / под общ. ред. А. Г. Мысливченко, А. П. Шептулина. – М. : Политиздат, 1988. – 446 с.

3 Рахманов, А. Б. Социальная философия К. Маркса и Ф. Энгельса и ее антиномии / А. Б. Рахманов. – Москва : URSS : Либроком, 2012. – 602 с.

# Тэма 9. Філасофія К’еркегора, Шапенгаўэра, Ніцшэ

У сярэдзіне XIX ст. адбываецца разрыў у традыцыі і філасофія набывае новае аблічча. Гэта ўвасабляецца ў такіх постацях, як Сёрэн К’еркегор, Артур Шапенгаўэр і Фрыдрых Ніцшэ.

У іх вучэннях адбываецца крытыка рацыяналізму з яго прэтэнзіяй пры дамамозе розуму цалкам растлумачыць свет. К’еркегор і Шапенгаўэр прама палемізавалі з Гегелем, Ніцшэ – з усёй папярэдняй традыцыяй.

Кожны з гэтых мысліўцаў меў трагічны асабісты лёс. Яны былі неўладкаванымі ў жыцці і адзінокімі людзьмі, не мелі вучняў і прызнання. Іх вучэнні мелі прароцкі характар і аказалі вялікі ўплыў на філасофію XX ст.

К’еркегор Сёрэн (1813–1855) быў не толькі філосафам, але таксама пратэстанцкім тэолагам і пісьменнікам. Яго асноўнымі творамі з’яўляюцца: “З запісак таго, хто яшчэ жыве” (1838), “Аб паняцці іроніі»” (1841), “Павучальныя прамовы” (1842), “Альбо – альбо” (1843), “Хвароба да смерці” (1849), “Уводзіны ў храсціянства” (1850).

Сваю дзейнасць К’еркегор разглядаў як адстойванне чысціні першапачатковага хрысціянства. Ён настойваў на трансцэндэнтнасці[1] Бога і неабходнасці вяртання да біблейскай рэлігійнасці.

Цэнтральнае месца ў вучэнні К’еркегора займае канцэпцыя трох стадый чалавечага існавання: эстэтычнай, этычнай і рэлігійнай.

На першай з іх чалавек імкнецца атрымаць задавальненне ад рэчаіснасці. Але такім чынам ён губляе сябе, жыве толькі знешнімі асалодамі. (Сімвалам гэтай стадыі з’яўляецца Дон Жуан). Аднак чалавек не можа жыць толькі знешнім, і таму пераходзіць да другой, этычнай, стадыі. На ёй ён добраахвотна падпарадкоўваецца маральнаму закону, асэнсоўвае свой абавязак перад ім. (Сімвалам гэтай стадыі з’яўляецца Сакрат). Але і гэта не з’яўляецца сапраўднай духоўнасцю, бо чалавек саманадзейна ўпэўнены, што менавіта ад яго залежыць ажыццяўленне дабра. Таму ён не хоча ведаць пра вечнасць і ўзвысіцца да Бога. Асэнсаванне гэтага вядзе да рэлігійнай стадыі. На ёй чалавек цалкам адмаўляецца ад сябе і ў акце веры давяраецца Богу. Сімвалам гэтай стадыі з’яўляецца Аўраам, які па загаду Бога быў гатовы зрабіць жахлівы з пункту погляду маралі ўчынак – прынесці ў ахвяру свайго адзінага сына Ісаака.

---

[1] Трансцэндэнтны (ад лац. *transcendere – пераходзіць, пераступаць*) – той, хто выходзіць за межы гэтага свету.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Шырокую вядомасць філасофія К’еркегора атрымала ў пачатку XX ст., калі да яе звярнулася дыялектычная тэалогія, а потым экзістэнцыялізм.

Артур Шапенгаўэр (1788–1860) вядомы сваім адзіным творам: “Свет як воля і ўяўленне” (1818). У ім погляды філосафа прадстаўлены ў закончаным выглядзе, у далейшых працах яны толькі дапаўняюцца і развіваюцца. Асноўнае яго палажэнне: свет ёсць не што іншае, як уяўленне. У адпаведнасці з вучэннем Канта, Шапенгаўэр сцвярджаў, што пачуццёвы свет існуе толькі ў свядомасці суб’екта і не мае незалежнага ад яе існавання. Няма ні сонца, ні зямлі, а ёсць толькі вока, якое бачыць, і рука, якая дакранаецца. Ніхто не можа выскачыць з сябе, каб убачыць рэчы самі па сабе. Рэальнай асновай свету з’яўляецца воля да існавання. Эмпірычны свет – гэта яе аб’ектывацыя, вышэйшай стадыяй якой з’яўляецца чалавек. Кожнай аб’ектывацыі ўласціва імкненне да панавання, што абумоўлівае “вайну ўсіх супраць усіх”. У чалавеку гэтае імкненне знаходзіць найбольш інтэнсіўнае выражэнне, менавіта яно асуджае чалавека на бессэнсоўную мітусню, якая параджае пакуты.

Далейшыя разважанні Шапенгаўэра запазычаны з будызму. Каб пазбавіцца ад крыніцы пакут, чалавек павінен пераадолець волю да жыцця і адмовіцца ад жаданняў. Аснову маральных паводзін чалавека складаюць, па Шапенгаўэру, два прынцыпы: аскетызм да сябе і альтруізм да іншых. Канчатковая мэта жыцця чалавека – гэта тое, што ў будызме называецца нірванай.

Ідэі Шапенгаўэра ўвайшлі ў склад неакантыянства, філасофіі жыцця, экзістэнцыялізму, інтуітывізму, прагматызму, псіхааналізу, ён аказаў уплыў на погляды Р. Вагнера, Э Гартмана, Ф. Ніцшэ, Т. Мана, М. Пруста, Ул. Салаўёва, Л. Талстога, А. Фета і інш.

Пры знаёмстве з поглядамі Ф. Ніцшэ трэба ўлічваць, што ён – адна з самых яскравых і спрэчных постацяў у гісторыі філасофіі. Большасць яго палажэнняў маюць свядома парадаксальны характар і іх нельга ўспрымаць непасрэдна, без крытычнага асэнсавання. Каштоўныя хутчэй тыя пытанні, якія ён паставіў, чым адказы, якія ён на гэтыя пытанні даў.

Асноўнымі яго творамі з’яўляюцца: “Нараджэнне трагедыі з духу музыкі” (1872), “Несвоечасовыя разважанні” (1873–1876), “Так казаў Заратустра” (1883–1885), “Чалавечае, занадта чалавечае” (1878–1880), “Вясёлая навука” (1882), “Па той бок дабра і зла” (1886), “Воля да ўлады” (1889–1901). Іх асаблівасцю з’яўляецца незвычайны для філасофіі стыль афарызмаў і дыфірамбаў.

Ніцшэ не быў прафесійным філосафам і паводзіў сябе хутчэй як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

прарок, чым як прафесар. Ён супрацьпастаўляў сваю філасофію філасофіі спецыялістаў. Па адукацыі ён быў філолаг, і яго творы належаць хутчэй літаратуры, чым філасофіі. У той жа час аб філалогіі ён адзываўся вельмі пагардліва, называў яе пачварай, зачатай багіняй Філасофіяй з нейкім ідыётам. Ніцшэ лічыцца заснавальнікам філасофіі жыцця, у сваіх творах ён праслаўляў сілу, энергію, волю. У той жа час ён быў чалавекам з вельмі няўстойлівай нервовай сістэмай, меў перапады настрою, быў непрыстасаваным да жыцця і апошнія дванаццаць гадой правёў у стане вар’яцтва. Розум пакінуў яго ў 1889 г. ў Турыне, калі ён пабачыў, як рамізнік збівае каня.

Вучэнне Ніцшэ – род духоўнага практыкавання, ён шмат разоў паўтарае свае палажэнні, асноўнымі з якіх з’яўляюцца:

1. Пераацэнка ўсіх каштоўнасцей. Еўрапейская культура сфарміравалася ў межах платанічна-хрысціянскіх ідэй аб сапраўдным пазазямным свеце і, адпаведна, пагардзе да света зямнога. Гэтую пагарду Ніцшэ разглядае як праяву нігілізму. Ён лічыць, што яго трэба пераадолець і зыходзіць з каштоўнасцей таго зямнога свету, у якім чалавек жыве: сілы, энергіі, волі і г. д.

2. Смерць Бога – сімвал эпохі, якая ідзе за нігілізмам. Азначае страту веры ў вышэйшыя каштоўнасці, якімі да гэтага кіравалася культура.

3. Звышчалавек – істота, якая па сваёй магутнасці павінна была пераўзысці сучаснага чалавека настолькі, наколькі апошні пераўзышоў малпу; сканцэнтроўвае ў сабе сілы жыцця; прымае жыццё ў яго найбольш экстрэмальных праявах; творца, воля якога накіроўвае гістарычнае развіццё. Прататыпамі звышчалавека Ніцшэ лічыў Аляксандра Македонскага, Цэзара, Чэзарэ Борджыа і Напалеона.

4. Воля да ўлады. Сфарміравалася як супрацьпастаўленне арыентацыі на трансцэндэнтнае дэкадэнцкага свету. Разумелася як іманентны, жывы, ірацыянальны пачатак усяго, што ёсць у свеце. Згодна з Ніцшэ, станаўленне ёсць намаганне, а імкненне да росту ёсць умова захавання жыцця. Гэта намаганне, “прагу жыцця”, Ніцшэ называе “воляй да ўлады”. Разумее яе анталагічна, яна сутнасць быцця.

У асноўным Ніцшэ аказаў уплыў на тых мысліўцаў XX ст., якія аналізавалі крызісныя з’явы ў еўрапейскай культуры.

## Літаратура

1 Быховский, Б. Э. Кьеркегор / Б. Э. Быховский. – М. : “Мысль”, 1972. – 238 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

2 Быховский, Б. Э. Шопенгауэр / Б. Э. Быховский. – М. : “Мысль”, 1975. – 206 с.
3 Гайденко, П. П. Трагедия эстетизма. О миросозерцании Серена Киркегора / П. П. Гайденко. – М. : Республика, 1997. – 207 с.
4 Немировская, Л. З. Ницше : мораль “по ту сторону добра и зла” / Л. З. Немировская. – М. : Знание, 2003. – 213 с.
5 Ясперс, К. Ницше и христианство / К. Ясперс // Философские науки. – 1999. – № 3. – С. 117–129.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Тэма 10. Філасофія ХХ стагоддзя

Еўрапейскую філасофскую традыцыю можна ўмоўна падзяліць на два этапы: класічны і некласічны. Першы пачынаецца з VI ст. да н. э і працягваецца да сярэдзіны XIX ст., другі – з пачатку ХХ ст. Вучэнні К’еркегора, Шапенгаўэра, Ніцшэ – пераходны прамежак паміж гэтымі этапамі. Раней некласічная філасофія яшчэ называлася сучаснай і атаясамлівалася з філасофіяй ХХ ст. Зараз сучасная філасофія – гэта філасофія пачатку XXI ст.

Трэба ўлічваць, што некласічная філасофія ўяўляе сабой складаную і разнастайную з’яву. Мы можам схематычна пералічыць толькі яе некаторыя асноўныя рысы.

1. Асэнсаванне перарванасці традыцыі. Гэта зафіксавана і шэрагам філосафаў: яны ўспрымалі сваю творчасць як тое, што адрозніваецца ад папярэдняй філасофіі.

2. Класічная філасофія прэтэндавала на ўсеагульнае тлумачэнне Сусвету. Некласічная філасофія ад гэтых прэтэнзій адмаўляецца і імкнецца растлумачыць толькі адзін з бакоў рэчаіснасці.

3. Для класічнай філасофіі ў цэлым быў уласцівы рацыяналізм – вера ў тое, што розум з’яўляецца асноўным інструментам пазнання свету і што паступова пры яго дапамозе свет будзе пазнаны ўсё больш поўна. У некласічнай філасофіі адбываецца крытыка рацыяналізму, якая ідзе ў двух асноўных накірунках: а) паказваецца, што рацыянальнае пазнанне мае абмежаваны характар і не можа ахапіць усю рэчаіснасць; б) розум разглядаецца як сродак не столькі пазнання, колькі панавання. Пры яго дапамозе ствараецца схема рэчаіснасці, якая лічыцца адзіна правільнай і навязваецца.

4. Узорам метадалогіі для класічнай філасофіі з’яўлялася прыродазнаўства. Філосафы імкнуліся пабудаваць свае творы ў выглядзе навуковых трактатаў. Філасофія ХХ ст. ад гэтага адмаўляецца

і арыентуецца хутчэй на літаратуру. На месца навуковых трактатаў прыходзяць эсэ. Найбольш яскравы праклад – творы экзістэнцыялістаў, персаналістаў, постструктуралістаў і постмадэрністаў.

5. Мноства школ і накірункаў. Калі казаць пра філасофію Новага часу, то яе, у прынцыпе, можна апісаць з пункту погляду двух кірункаў: рацыяналізму і эмпірызму. У ХХ ст. з'явіліся неа- і постпазітывізм, экзістэнцыялізм, персаналізм, фрэйдызм і неафрэйдызм, неамарксізм, неатамізм, структуралізм, постструктуралізм, постмадэрнізм і г. д.

Мы схематычна разгледзім наступныя накірункі некласічнай філасофіі.

1. Пазітывізм (фр. *positivisme*, ад лац. *positivus* – *станоўчы*) – філасофская вучэнне і накірунак у філасофіі навукі, у якім сцвярджалася, што адзінай крыніцай і ісціных сапраўдных ведаў з'яўляюцца эмпірычныя даследаванні, а філасофскія палажэнні не маюць пазнаваўчай каштоўнасці.

Вылучаюць чатыры этапы развіцця пазітывізму:

1) класічны пазітывізм. Заснавальнікам гэтага пазітывізму з'яўляецца французскі філосаф Агюст Конт (1798–1857). У праграмнай кнізе "Дух пазітыўнай філасофіі" (1844) ён пастуляваў наяўнасць трох стадый інтэлектуальнага развіцця чалавецтва: тэалагічнай, метафізічнай і навуковай. На апошняй стадыі філасофія адмаўляецца ад абмеркавання традыцыйных метафізічных праблем і займаецца абагульненнем і сістэматызацыяй вынікаў навуковага пазнання.

Іншымі прадстаўнікамі класічнага пазітывізму з'яўляюцца Джон Сцюарт Міль (806–1873) і Герберт Спенсэр (1820–1903).

2) эмпірыякрытыцызм. Існаваў ў канцы XIX – пачатку ХХ стст. Лідэрам пазітывізму ў гэты час робіцца аўстрыйскі фізік Эрнст Мах (1838–1916). У гэты час былі адкрыты электрамагнітныя з'явы, якія немагчыма было растлумачыць з пункту погляду існуючай механічнай карціны свету.

Свет, з пункту погляду Маха, складаецца з нейтральных элементаў, якія ўяўляюць сабой аб'яднанне фізічнага і псіхічнага. Вучэнне аб нейтральных элементах павінна было, на думку Маха, пераадолець крайнасці матэрыялізму і ідэалізму і вырашыць супярэчнасць паміж гэтымі накірункамі.

3) неапазітывізм альбо лагічны пазітывізм. Існаваў у 20–50 гг. ХХ ст. Яго прадстаўнікамі з'яўляюцца: Морыц Шлік (1882–1936), Людвіг Вітгенштэйн (1889–1951), Рудольф Карнап (1891–1970), Ота Нейрат (1882–1945). Грунтаваўся на эмпірызме і аналізе мовы. Задачай філасофіі лічылася не сістэматызацыя спецыяльна-навуковых ведаў, як гэта было ў класічным пазітывізме, а распрацоўка метадаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

аналізу навукі праз аналіз яе мовы. Асноўным такім метадам лічылася верыфікацыя (ад лац. *verus – сапраўдны* і *facio – раблю*) – эмпірычнае пацвярджэнне тэарэтычных палажэнняў дадзенымі вопыта.

Згодна з неапазітывізмам навуковымі з'яўляюцца толькі тыя палажэнні, якія можна верыфікаваць. Палажэнні філасофіі (метафізікі) верыфікаваць немагчыма, таму яны не ісцінныя і не памылковыя, але бессэнсоўныя. Але неапазітывізм сутыкнуўся з тым, што прынцыпа верыфікацыі не вытрымлівае ні адна навуковая тэорыя.

4) постпазітывізм. Яго асноўныя прадстаўнікі: Карл Попер (1902–1994), Томас Кун (1922–1996), Імрэ Лакатас (1922–1974), Пол Фейерабенд (1924–1994), Майкл Палані (1891–1976), Сцівен Тулмін (нар. 1922). Усіх іх аб'ядноўвае крытычнае стаўленне да той праграмы абгрунтавання навукі, якую прапанаваў неапазітывізм.

Замест верыфікацыі К. Попер прапанаваў фальсіфікацыю (лат. *falsus – несапраўдны*) ў якасці крытэрыя дэмаркацыі ведаў: навуковай з'яўляецца толькі тая тэорыя, якая ў прынцыпе можа быць абвергнута (фальсіфікавана) вопытам.

У працы Томаса Куна «Структура навуковых рэвалюцый» (1962) было паказана, што навука развіваецца не шляхам паступовага накаплення ведаў і набліжэння да ісціны, але праз змену парадыгм[1]. Кун вылучаў у развіцці навукі два перыяды: перыяд нармальнай навукі і навуковую рэвалюцыю.

Лакатас апісаў навуку як канкурэнтную барацьбу "навукова-даследчых праграм", якая складаюцца з "жорсткага ядра" прынятых фундаментальных дапушчэнняў (не могуць быць зменены ўнутры праграмы) і "ахоўнага пояса" дапаможных гіпотэз, якія мяняюцца і прыстасоўваюцца да контрпрыкладаў праграмы.

Фейерабенд адстойваў ідэю аб тым, што не павінна існаваць такіх метадалагічных правіл, якія заўсёды выкарыстоўваюць вучоныя. Ён выступаў за метадалагічны анархізм, бо любы метад ставіць межы ў дзейнасці вучонага і такім чынам абмяжоўвае прагрэс.

2. <u>Экзістэнцыялізм</u> – філасофскі кірунак XX ст., цэнтрам увагі якога з'яўляецца існаванне чалавека (ад. позднелац. *existentia – існаванне*). Быў распаўсюджаны ў Еўропе і ЗША ў першай палове XX ст. Найбольш вядомыя прадстаўнікі: Карл Ясперс (1883–1969), Марцін Хайдэгер (1889–1976), Жан Поль Сартр (1905–1980), Габрыэль Марсель (1889–1973), Альбер Камю (1913–1960).

Адна з характэрных рыс экзістэнцыялізму – тое, што ён шчыльна звязаны з мастацкай літаратурай. Вядомы творы Сартра "Дарогі

[1] Парадыгма (ад грэч. *paradeigma* – прыклад, узор) – тэарэтычная схема тлумачэння і вывучэння рэчаіснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ Ф.СКОРИНЫ

свабоды” (1945–1949), “Мухі” (1943), “Д’ябал і Гасподзь Бог” (1951), Камю “Калігула” (1944), “Падзенне” (1956), “Чужы”(1942), “Чума” (1947), Марселя “Расколаты свет” (1933), “Смага” (1938), “Рым больш не ў Рыме” (1951) і іншыя. Камю (1957 г.) і Сартру (1964) былі прысуджаны Нобелеўскія прэміі па літаратуры.

У экзістэнцыялізме выразіліся духоўныя праблемы заходняга чалавека XX ст. Яго асноўныя тэмы: чалавечае існаванне, лёс асобы, свабода, вера і нявер’е, праблема сэнсу жыцця. Сваімі папярэднікамі экзістэнцыялісты лічаць Б. Паскаля, С. К’еркегора, М. Унамуна, Ф. М. Дастаеўскага, Ф. Ніцшэ.

Вылучаюць рэлігійны (Ясперс, Марсель) і атэістычны (Хайдэгер, Сартр, Камю) экзістэнцыялізм.

У экзістэнцыялізме адбыўся паварот ад гнасеалогіі да анталогіі. Асноўным недахопам папярэдняй філасофіі экзістэнцыялісты лічылі падзел рэчаіснасці на аб’ект і суб’ект. Сапраўдная філасофія павінна зыходзіць з іх еднасці, якой з’яўляецца экзістэнцыя.

Пазначаюцца яе наступныя модусы: 1. Закінутасць – чалавек заўсёды знаходзіць сябе ў акрэсленай сітуацыі, якая не з’яўляецца актам яго свабоднага выбару і з якой ён павінен лічыцца. Экзістэнцыя ёсць “быццё-ў-свеце”. 2. Трансцэндзіраванне[1] – з пункту погляду рэлігійнага экзістэнцыялізму адбываецца ў накірунку да Бога. Атэістычны экзістэнцыялізм лічыць, што трансцэндэнцыя мае ілюзорны характар і адбываецца ў нішто. 3. Часавасць – экзістэнцыя канечная і цягнецца пэўны час. Яе часавасць адрозніваецца ад аб’ектыўнага часу, як чыстай колькасці, абыякавай да свайго зместу. Экзістэнцыяльная часавасць вызначаецца тымі падзеямі, якія ў ёй адбываюцца. 4. Свабода, якая разумеецца як свабода выбару. Свабода чалавека адрозніваецца ад свабоды жывёл, паколькі іх учынкі вызначаюцца іх сутнасцю, чалавек жа ёй не валодае і таму самастойна будуе свае паводзіны і нясе за іх адказнасць.

3. <u>Неатамізм</u> – найбольш аўтарытэтны кірунак каталіцкай філасофіі. Грунтуецца на вучэнні  Фамы Аквінскага. Пасля апублікавання ў 1879 годзе энцыклікі папы Льва XIII “Aeterni Patris” (“Айцу вечному”) ён набыў статус афіцыйнай філасофскай дактрыны каталіцкай царквы. Вядучымі прадстаўнікамі неатамізму з’яўляюцца Эцьен Жыльсан (1884–1978), Жак Марытэн (1882–1973), Карл Ранер (1904–1984), Караль Вайтыла (1920–2005) і інш. Ужо ў першай палове XX ст. разам з тэндэнцыяй на захаванне філасофіі Фамы з’явіліся імкненні дапоўніць яе палажэннямі іншых філасофаў. Пасля

[1] Ад лац. *transcendens* – той, хто выходзіць за межы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

II Ватыканскага сабору (1962–1965 гг.), які ўзяў курс на аджорнамэнта (італ. *aggiornamento – адпаведнасць сённяшняму дню*), гэтыя тэндэнцыі ўзмацніліся. Зараз неатамізм – не адзіны, але вядучы філасофскі кірунак у каталіцкай царкве. Яго асноўнымі праблемамі з'яўляюцца:

1. <u>Праблема суаднясення розуму і веры</u>. У філасофіі неатамізму гармонія розуму і веры абгрунтоўваецца праз канцэпцыю ступеняў пазнання Фамы Аквінскага.

2. <u>Праблема быцця</u>. Вырашаецца на грунце крэацыянізму. Неатамісты сцвярджаюць, што ў аснове ўсяго існуючага знаходзіцца татальнасць чыстага боскага быцця, якое параджае разнастайнасць стварэння. Разнастайнасць быцця тлумачыцца пры дапамозе сфармуляванай яшчэ Арыстоцелем канцэпцыі гілемарфізму[1].

3. <u>Праблема актыўнасці чалавека</u>. У неатамізме чалавек разглядаецца як творца культуры, якая ёсць працэс самаўдасканальвання чалавека. Абнаўленне культуры звязваецца з увасабленнем у жыццё "інтэгральнага гуманізму", калі чалавек бярэцца ў адзінстве яго пачуццяў, розуму і веры.

<u>Персаналізм</u> (от лац. *persona – асоба*), філасофскі накірунак, які выходзіць з ідэі аб тым, што асоба чалавека з'яўляецца першаснай творчай рэчаіснасцю, а ўвесь свет – праява творчай актыўнасці "Вярхоўнай Асобы" – Бога. Сфарміраваўся ў 20–30-я гг. XX ст. Найбольш вядомым яго прадстаўнікам з'яўляецца французскі філосаф Эмануэль Мунье (1905–1950).

У аснове персаналізму знаходзіцца прынцып дыялагічнага суіснавання чалавека і Бога. Персаналісты зыходзяць з камунікатыўнай тэорыі асобы: Бог разглядаецца як той Другі, ва ўзаемадзеянні з якім чалавек робіцца асобай. У сацыяльнай тэорыі быў сфарміраваны ідэал "персанальнай і камунікатыўнай цывілізацыі", альбо "грамадства асобаў". Было абвешчана, што асоба – вышэйшая сутнасць дэмакратыі.

<u>Структуралізм</u> – агульная назва для шэрагу накірункаў у гуманітарным пазнанні XX ст., звязаных з выяўленнем структуры – сукупнасці такіх шматузроўневых узаемаадносін паміж элементамі цэлага, якія захоўваюць устойлівасць пры разнастайных зменах і пераўтварэннях. Структуралізм больш адэкватна разглядаць не як філасофію, а як метадалагічную праграму, якая за ўзор бярэ метады прыродазнаўчых навук.

Пачатак фарміравання метадалогіі структуралізму звязваецца з выхадам працы швейцарскага вучонага Фердзінанада дэ Сасюра

[1] Гилемарфизм (ад грэч. *hyle –матэрыя* і *morphe – форма*) – спосаб тлумачэння рэчаў праз суаднясення іх матэрыі и формы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

(1857–1913) “Курс агульнай лінгвістыкі”. Яе галоўныя палажэнні: 1. Мова з’яўляецца сістэмай знакаў. 2. Кожны знак можа выражаць нешта толькі ва ўзаемадзеянні з іншым знакам.

У 1950-х гг. французскі этнограф К. Леві-Строс (1908–2009) распаўсюдзіў метады структуралізму на даследаванне культуры. Апорай яго метада стала вылучэнне так званых несвядомых бінарных апазіцый (прырода – культура, расліннае – жывёльнае, сырое – варанае і г. д.).

Менавіта працы Леві-Строса (які, дарэчы, лічыў сябе адзіным сапраўдным структуралістам) паклалі пачатак французскаму структуралізму, альбо уласна структуралізму, які займаўся аналізам культуры. Да яго належаць таксама Жан Лакан (псіхааналіз), Ралан Барт (літаратуразнаўства масавая культура), ранні Мішэль Фуко (гісторыя навукі). Структуралізм, з яго прэтэнзіяй на навуковасць, выконваў у Францыі тую ж ролю, якую ў іншых краінах выконваў неапазітывізм.

У структуралізме выразіўся пратэст супраць суб’ектывізму экзістэнцыялізму. Найбольшая цікавасць да яго назіралася – у 50-х – першай палове 60-х гг. Але потым яна пайшла на памяншэнне. Пачалі шукаць тое, што выходзіць за межы структур. У выніку самакрытыкі структуралізму і развіцця яго тэндэнцый узнік постструктуралізм.

Постструктуралізм – падыходы ў сацыяльна-гуманітарным пазнанні 1970–1980-х гг. якія выходзілі з семіатычнай трактоўкі рэчаіснасці (як сукупнасці знакаў), але асноўная ўвага ў іх была сканцэнтравана на аналізе па-за структурных элементаў (на “вывараце” структуры). Галоўным іспульсам эвалюцыі структуралізму ў постструктуралізм з’явіліся майскія падзеі ў Парыжы 1968 г. Характэрны лозунг 1968 г.: “Структуры не выходзяць на вуліцы”. У цэнтры постструктуралізму – выкрыццё ўлады, якая рэалізуе сябе праз структуры культуры. Як і структуралізм, постструктуралізм быў распаўсюджаны ў асноўным у Францыі.

Асноўныя рысы: 1) крытыка метафізікі з яе арыентацыяй на логас; 2) непрыманне цэласнасці і схільнасць да ўсяго нестабільнага, супярэчлівага, фрагментарнага і выпадковага; 3) выкрыццё стратэгій ажыццяўлення ўлады, якія ў грамадстве не асэнсоўваюцца; 4) пошук маргінальных зон свабоды (жаданне, гісторыя, афекты, цела і г. д.).

Постструктуралізм з’явіўся філасофскай асновай для постмадэрнізму, таму шмат якія постструктуралісты ў далейшым зрабіліся постмадэрністамі.

Постмадэрнізм (фр. *postmoderne – пасля сучаснасці*) – кірунак у еўрапейскай культуры канца XX ст., у аснове якога – адмаўленне ўстановак сучаснасці (мадэрну) на прагрэс, рацыянальнае спасціжэнне рэчаіснасці, ўзмацненне ролі суб’екта і інш. Асноўныя прадстаўнікі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Жан-Франсуа Ліатар (1924–1998), Ралан Барт (1915–1980), Жорж Батай (1897–1962), Рычард Рорці (1931–2007), Жак Дэрыда (1930–2004), Жыль Дэлёз (1925–1995), Фелікс Гватары (1930–1992), Жан Бадрыяр (1929–2007), Юлія Крысцева (нар. 1935).

Пасля выхаду працы Ліатара "Постмадэрністскі стан: даклад аб ведах" (1979) пры дапамозе тэрміна "постмадэрінізм" сталі выражаць духоўную спецыфіку сучаснай эпохі. Асноўнай рысай постмадэрнізму Ліатар лічыў "адмаўленне ад метанаррацый" – ідэй і канцэпцый, якія прэтэндуюць на ўсеагульнае апісанне свету. Постмадэрнісцкая філасофія займае радыкальна крытычную пазіцыю адносна ідэй мадэрнізму і імкнецца падвергнуць іх "дэканструкцыі".

Можна вылучыць наступныя асноўныя рысы постмадэрнізму:

1. Людзі не маюць непасрэднага доступу да рэчаіснасці, таму няма адэкватных сродкаў для яе пазнання. Рэчаіснасць трактуецца як хаос, які арганізуецца пры дапамозе мовы, людзі з'яўляюцца "палоннымі мовы". Таму прырода рэчаіснасці вызначаецца тымі, хто валодае ўладай па фарміраванню мовы.

2. Ідэалам апісання з'яўляецца радыкальны плюралізм, а пазнаваўчым ідэалам – радыкальны рэлятывізм. Адмаўляецца само паняцце ісціны, лічыцца, што яно мае рэпрэсіўны характар.

3. Адмаўляецца любая іерархія, усё – раўназначна, няма розніцы паміж ісцінным і памылковым, прыгожым і брыдкім, дабром і злом. Адзін з аспектаў гэтага – адмаўленне так званых "бінарных апазіцый": "суб'ект-аб'ект", "мужчынскае-жаночае", "унутранае-вонкавае", "цэнтр-перыферыя".

4. Адмаўляецца суб'ект. Яго месца займаюць шматлікія безасабовыя структуры: патокі жаданняў (Дэлёз, Гватары), трансгрэсія і эратызм (Батай), спакушэнне (Бадрыяр) і г. д. Суб'ект разумеецца як від аб'екту. У выніку антрапацэнтрызм філасофіі Новага часу змяняецца мноствам анталогій, якія будуюцца ў адпаведнасці з тым ці іншым "аб'ектам".

5. Адмаўляецца магчымасць у сучасных умовах любой метафізікі. Гэта выліваецца ў адмаўленне ад самой філасофіі – яе праблем, катэгарыяльнага апарата, метадаў даследавання. Постмадэрнісцкая філасофія разглядае сябе як "постфіласофію".

## Літаратура

1 Адуло, Т. И. В поисках сущности бытия: философия на рубеже XX–XXI веков / Т. И. Адуло. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 446 с.

2 Бохеньский, М. Современная европейская философия / М. Бохеньский. – М. : Научный мир, 2000. – 256 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

3 Современная западная философия / под общ. ред. Т. Г. Румянцевой. – Мн. : Высшая школа, 2000. – 493 с.

4 Кузьмина, Т. А. Экзистенциальная философия / Т. А. Кузьмина. – Москва : Канон+, 2014. – 351 с.

5 Усовская, Э. А. Постмодернизм / Э. А. Усовская. – Мн. : Тетрасистем, 2006. – 256 с.

## Тэма 11. Руская філасофія

Пры вывучэнні рускай філасофіі трэба адзначыць наступнае:

1) яна з'яўляецца неад'емнай часткай еўрапейскай філасофскай традыцыі;

2) яна мае свае асаблівасці, якія адзначаюцца самімі расійскімі даследчыкамі і з'яўляюцца праявай спецыфікі рускай культуры. Прывядзем асноўныя з іх.

1. Вельмі вялікае значэнне на развіццё рускай філасофіі аказала праваслаўе, у межах якога, і ў гэтым яго адрозненне ад каталіцтва Заходняй Еўропы, не была сфарміравана трывалая філасофская традыцыя. У той жа час менавіта на глебе праваслаўя ў рускай філасофіі XIX – пачатку XX ст. была сфарміравана вялікая колькасць арыгінальных ідэй.

2. Для рускай культуры характэрны разрывы ў традыцыі. Самымі значнымі сярод іх былі: перамяшчэнне культурнага цэнтра з Кіева ў Маскву, пятроўская рэформа, Кастрычніцкая рэвалюцыя, распад Савецкага Саюзу і фарміраванне Расійскай дзяржавы ў яе цяперашнім выглядзе. Гэтыя разрывы адлюстраваліся і ў галіне філасофіі і парадзілі палеміку аб культурнай і філасофскай спецыфіцы Расіі, якая доўжыцца і па сённяшні дзень.

3. Неакадэмічнасць. Руская філасофія развівалася па-за сістэмай адукацыі. Першы расійскі ўніверсітэт быў заснаваны толькі ў 1755 г. Да выкладання філасофіі ўлады Расіі ставіліся насцярожана, яго то забаранялі, то дазвалялі ў абмежаваным выглядзе. Сітуацыю характарызуе выказванне міністра народнай асветы пры Мікалаі I князя Шырынскага-Шыхматава: "Карысць ад філасофіі вельмі няпэўная, а шкода відавочная".

4. Сувязь з літаратурай. Філасофскія ідэі змяшчаюцца ў творах А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля, Ф. І. Цютчава, Ф. М. Дастаеўскага, Л. Н. Талстога, Д. С. Меражкоўскага, А. І. Салжаніцына.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

5. Імкненне да цэласнага апісання рэчаіснасці, крытыка аналітычнага спосабу яе разгляду ў заходнееўрапейскай філасофіі. Для рускай філасофіі характэрна каштоўнасная накіраванасць разважанняў. Яна супрацьпастаўляе сябе абстрактным ведам пра чалавека і свет.

6. Сацыяльная накіраванасць. Шмат якія рускія філосафы шукалі шляхі духоўнага і сацыяльнага абнаўлення грамадства. Вельмі вялікае месца ў іх творах займалі разважанні над лёсам Расіі.

Умоўна ў развіцці рускай філасофіі можна вылучыць наступныя перыяды:

1. Кіеўскі. Пачатак развіцця рускай філасофіі з’вязваюць з хрышчэннем Русі ў 998 г. Пры гэтым адбыўся рэзкі пералом у светапоглядзе. На змену прыроднай рэлігіі прыйшла трансцэндэнтная, на змену пантэізму – монатэізм, абазначыўся падзел паміж дабром і злом, духам і плоццю, асэнсавана накіраванасць гісторыі і яе эсхаталагічны характар. На Русь трапляюць творы хрысціянскіх пісьменнікаў, з’яўляюцца працы рускіх аўтараў.

2. Маскоўскі. Характарызуецца рэлігійнай праблематыкай. Адбываецца палеміка паміж іясіфлянамі і несцяжацелямі. Афармляецца ідэалагічны прынцып супрацоўніцтва (сімфаніі) паміж дзяржавай і праваслаўнай царквой. Фарміруецца імперская дактрына “Масква – Трэці Рым”, якая набывае парадыгмальны характар у расійскім светапоглядзе. Да гэтага перыяду адносяцца такія мысліўцы, як Максім Грэк (1475–1555), Іосіф Валоцкі (1439–1515), Ніл Сорскі (каля 1433–1508) і інш.

3. XVIII ст. Рэформы Пятра І паклалі пачатак так званаму “Пецярбургскаму перыяду” у гісторыі рускай культуры. Адбылася сінхранізацыя культурнай эвалюцыі з Еўропай, а таксама раскол у грамадстве на празападную дваранскую эліту і асноўную масу насельніцтва, якая засталася пры старых культурных схемах.

У гэты час назіраецца шэраг растастайных тэндэнцый у рускай духоўнай культуры. Вядомым прадстаўніком навуковай свядомасці быў Міхаіл Васільевіч Ламаносаў (1711–1765). Працавалі такія праваслаўныя аўтары, як Ціхан Задонскі (1724–83) і Паісій Велічкоўскі (1722–1794). Прадстаўнікамі Асветніцтва былі Аляксандр Мікалаевіч Радзішчаў (1749–1802) і Мікалай Іванавіч Новікаў (1744–1818).

4. XIX ст. У Расіі фарміруецца філасофія ва ўласным сэнсе слова. Першым рускім філосафам лічыцца Пётр Якаўлевіч Чаадаеў (1794–1856). У сваім найбольш вядомым творы “Філазафічныя лісты” ён паставіў пытанне аб месцы Расіі ў свеце. Ацаніў яго вельмі крытычна. Сцвярджаў, што Расія мае цёмнае мінулае, бессэнсоўнае цяперашняе і няяснае будучае і рызыкуе безнадзейна адстаць ад дынамічнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Еўропы. Праблема, пастаўленая Чаадаевым, з'явілася нагодай для фарміравання школ заходнікаў і славянафілаў.

Першыя выступалі за самабытны шлях развіцця Расіі, які б адрозніваўся ад заходнееўрапейскага. Да славянафілаў належалі: Міхаіл Пятровіч Пагодзін (1800–1875), Сцяпан Пятровіч Шавыроў (1806–1864), Іван Васільевіч Кірэеўскі (1806–1856), Аляксей Сцяпанавіч Хамякоў (1804–60), Канстанцін Сяргеевіч Аксакаў (1817–1860), Мікалай Якаўлевіч Данілеўскі (1822–1885) і інш.

Заходнікі лічылі гісторыю Расіі часткай агульнасусветнага гістарычнага працэсу, выступалі за развіццё краіны па заходнееўрапейскаму шляху. Да іх належаць: Вісарыён Рыгоравіч Бялінскі (1811–1848), Аляксандр Іванавіч Герцен (1812–1870), Мікалай Платонавіч Агароў (1813–1877), Цімафей Мікалаевіч Graноўскі (1813–1855), Павел Васільевіч Аненкаў (1813–1887), Васіль Пятровіч Боткін (1811–1869), Канстанцін Дзмітрыевіч Кавелін (1818–1885).

У другой палове XIX ст. складваюцца такія філасофскія і грамадскія кірункі, як анархізм: Міхаіл Аляксандравіч Бакунін (1814–1876), Петр Аляксеевіч Крапоткін (1842–1921); пазітывізм: Пётр Лаўравіч Лаўроў (1823–1900); матэрыялізм: Мікалай Гаўрылавіч Чарнышэўскі (1828–1889), Мікалай Аляксандравіч Дабралюбаў 1836–1861, Дзмітрый Іванавіч Пісараў (1840–1868); марксізм: Георгій Валянцінавіч Пляханоў (1856–1918), Уладзімір Ільіч Ленін (1870–1924), Аляксандр Аляксандравіч Багданаў (1873–1928).

Першым арыгінальным рускім філосафам еўрапейскага ўзроўню лічыцца Уладзімір Сяргеевіч Салаўёў (1853–1900). Ён імкнуўся да сінтэзу еўрапейскіх і рускіх духоўных пачаткаў.

5. <u>Пачатак XX ст.</u> Гэты час называецца "срэбраным векам" рускай культуры. Працавалі цэлы шэраг выдатных філосафаў: Леў Шэстаў (1866–1938), Сямён Людвігавіч Франк (1877–1950) Мікалай Ануфрыевіч Лоскі (1870–1965), Васіль Васільевіч Разанаў (1856–1919), Мікалай Аляксандравіч Бердзяеў (1874–1948), Сяргей Мікалаевіч Булгакаў (1871–1944), Павел Аляксандравіч Фларэнскі (1882–1937) і інш.

Былі створаны рэлігійна філасофскія аб'яднанні, выходзілі часопісы і зборнікі прац, самым вядомым сярод якіх былі "Вехі". Для шэрагу рускіх філосафаў гэтага часу характэрна эвалюцыя ад марксізму да ідэалізму і далей – да праваслаўя, якое асэнсоўваецца як духоўная аснова рускай самасвядомасці.

6. <u>Савецкі перыяд (1917 – канец XX ст.).</u> Адбыўся раскол у рускай культуры. У 1922 г. па ініцыятыве Леніна вялікая група гуманітарнай інтэлігенцыі была выслана за мяжу. Сярод іх былі і вядомыя

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ імя Ф. СКАРЫНЫ

філосафы – Бердзяеў, Франк, Трубяцкой, Ільін, Вышаслаўцаў і інш. Гэтыя філосафы дзейнічалі ў эміграцыі і зрабілі ўклад у развіццё сусветнай філасофскай думкі.

У Савецкім Саюзе афіцыйнай ідэалогіяй робіцца марксізм. Іншыя філасофскія накірункі не дапускаюцца. Але і ў гэтых умовах адбывалася развіццё філасофіі ў галінах эстэтыкі, гісторыі філасофіі, тэорыі пазнання.

7. Сучасны перыяд (з канца 80-х гг. XX ст.). Пасля распаду Савецкага Саюзу адбываецца ўзнаўленне рускай філасофскай традыцыі і яе развіццё.

## Літаратура


1 Громов, М. Н. Русская философская мысль X–XVII веков: учебн. пособие / М. Н. Громов, Н.С. Козлов. – М. : Изд-во МГУ, 1990. – 288 с.

2 Евлампиев, И. И. История русской философии: учебн. пособие / И. И. Евлампиев. – М. : Высш. шк., 2002. – 584 с.

3 Зеньковский, В. В. История русской философии : в 2 т. / В. В. Зеньковский. – Ростов-на-Дону : "Феникс", 1999. – 2 т.

4 Лосский, Н. О. История русской философии / Н. О. Лосский. – М. : Советский писатель, 1991. – 480 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

# Тэма 12. Філасофія Беларусі

Трэба ўлічваць, што паняцце “філасофія Беларусі” ўжываецца ў вузкім і шырокім сэнсе. У вузкім (больш строгім) сэнсе – гэта гісторыя тых філасофскіх вучэнняў, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі. У шырокім сэнсе – гэта ўвесь комплекс сацыяльна-культурных ідэй (філасофскіх, рэлігійных, грамадскіх, мастацкіх і г. д.), якія існавалі на тэрыторыі Беларусі.

Гісторыя філасофіі на Беларусі ўяўляе сабой складаны шматэтапны і шматвектарны працэс, звязаны з фарміраваннем беларускай культуры. Пры яе вывучэнні трэба ўлічваць наступнае:

1. Прамежкавае геаграфічнае становішча. З культурнага пункту погляду Беларусь знаходзіцца паміж Еўропай і Расіяй і адчувае ўплывы з двух бакоў. На розных этапах нашай гісторыі гэтыя ўплывы

мелі розную моц, характар і вынікі. Гэта адбілося на развіцці нашай філасофскай думкі.

2. Разрывы ў культурнай традыцыі. У часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай наша культура была часткай еўрапейскай. Адбываліся тыя ж працэсы, што і ў астатняй Еўропе: Адраджэнне, Рэфармацыя, Контррэфармацыя, Асветніцтва. У канцы XVIII ст. адбылося далучэнне да Расіі. У пачатку XX ст. тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Савецкага Саюзу. У 1991 г. утварылася самастойная беларуская дзяржава, што абумовіла пошукі нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці.

3. Сацыяльна-культурная цэласнасць. Нягледзячы на разрывы, на Беларусі была адзіная філасофская традыцыя. Для яе былі характэрны: імкненне асэнсаваць месца Беларусі ў свеце, хрысціянская праблематыка, плюралізм думак, талерантнасць, спалучэнне розных філасофскіх традыцый.

4. Уключэнне філасофскіх разважанняў у іншыя формы культуры, такія як рэлігія, літаратура, ідэалогія .

Асноўнымі этапамі гісторыі філасофскай думкі на Беларусі з’яўляюцца:

1. Сярэднявечча. Прадумовай фарміравання філасофскай думкі на Беларусі з’явілася прыняцце хрысціянства ў 992 г. У якасці першай хрысціянскай асветніцы называюць полацкую князёўну Рагнеду (каля 960–1000). Хрысціянскімі асветнікамі былі таксама Еўфрасіння Полацкая (1110 (?) – 1173), Кірыла Тураўскі (каля 1130–1182) і Клімент Смаляціч (памёр пасля 1164).

2. Адраджэнне. У гэты перыяд фарміруецца філасофія ва ўласным сэнсе гэтага слова. Першым прафесійным філосафам лічыцца Францыск Скарыны (1490–1551). Яго дзейнасць падпарадкавана задачы актуалізацыі хрысціянска-гуманістычных каштоўнасцей. Свае думкі ён выказаў у прадмовах і пасляслоўях да Біблії, выдадзенай у 1517–1519 гг. у Празе.

3. Рэфармацыя на Беларусі з'яўлялася часткай агульнаеўрапейскага рэфармацыйнага руху і мела тыя ж перадумовы, што і ў іншых краінах. Найбольш цікавым у беларускім пратэстанцтве з’яўляецца такі накірунак, як антытрынітарызм[1], альбо арыянства[2]. У ім існавалі дзве плыні: 1) памяркоўная, да якой належалі Сымон Будны (каля 1530–1593) і Васіль Цяпінскі (каля 1540–1603); 2) радыкальная, прадстаўнікамі якой былі Пётр з Ганёнзы, Якуб з Калінаўкі, Марцін Чэховіч.

[1] Антытрынітарызм (ад грэч. *anti* – *супраць* і лац. *trinitas* – *Троіца*) – вучэнне, якое адмаўляе Троіцу.

[2] Ад імя александрыйскага святара Арыя (VI ст.), які адмаўляў Троіцу.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

4. Канец XVI–XVII стст. Перыяд Контррэфармацыі і барока. Адбываецца паслабленне і знікненне ідэй гуманізму і Рэфармацыі. Фармулююцца задачы выяўлення нацыянальна-культурнай своеасаблівасці беларусаў. Найбольш вядомымі мысліўцамі гэтага перыяду з'яўляюцца Казімір Лышчынскі (1634–1689) і Сімяон Полацкі.

5. XVII – пач. XVIII стст. На гэтым этапе адбываецца ідэйная барацьба праваслаўя і ўніяцтва. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі першага былі ў гэты перыяд Лявонцій Карповіч (1580–1620) і Мялецій Сматрыцкі (1575–1633), другога – Леў Крэўза (? –1638) і Іасафат Кунцэвіч (1580–1623). Філасофская думка гэтага перыяду канцэнтравалася ў сферы ўплыву каталіцкіх манаскіх законаў.

6. Сярэдзіна XVIII – пачатак XIX стст. У гэты перыяд у філасофскай думцы афармляюцца арыентацыя на асэнсаванне адкрыццяў у галіне прыродазнаўства, што праявілася ў дзейнасці філосафаў-эклектыкаў: Антон Скарульскі (1715–1780), Станіслаў Шадурскі (1726–1786), Бенедыкт Дабшэвіч (1722–1794). Да філосафаў-асветнікаў належылі Еранім Страйноўскі (1752–1816), Іахім Храптовіч (1729–1812), Казімір Нарбут (1738–1807), Ян Снядэцкі (1756–1830)).

7. XIX ст. У гэты перыяд уласна філасофская традыцыя на Беларусі перарываецца. Узмацняецца пошук нацыянальнай ідэнтыфікацыі. З сярэдзіны XIX ст. ідэі нацыянальнага адраджэння асэнсоўваюцца ў межах мастацкай літаратуры: Ян Чачот (1796–1847), Уладзіслаў Сыракомля (1823–1862), Ян Баршчэўскі (1794–1851), Вінцэнт Дунін-Марцынкевіч (1808–1884), Францішак Багушэвіч (1840–1900) і інш. Нацыянальна-вызваленчая праграма была выражана ў творчасці Кастуся Каліноўскага (1838–1864). Адбываецца фарміраванне тэорыі заходнерусізму, галоўным ідэолагам якой быў Міхаіл Каяловіч (1828–1891).

8. У пачатку XX ст. традыцыя ідэй нацыянальнага адраджэння была працягнута Янкай Купалай (1882–1942), Якубам Коласам (1882–1956), Максімам Багдановічам (1891–1917) і інш. Асэнсаванню месца Беларусі ў свеце была прысвечана праца Ігната Канчэўскага (Абдзіраловіча) (1896–1923) "Адвечным шляхам" (1921).

9. З канца 20-х па пачатак 90-х гг. XX ст. Развіццё філасофскай думкі на Беларусі адбываецца ў межах савецкай філасофіі. Даследаванні вядуцца ў галіне гісторыі філасофіі і рэлігіі (М. Іваноўскі, М. М. Нікольскі, Б. Э. Быхоўскі, Л. С. Майхровіч, У. М. Конан), філасофіі навукі (В. С. Сцёпін і інш.).

10. З канца 80-х гг. XX ст. па сённяшні час. Адбываецца распад Савецкага Саюза і ўтварэнне Рэспублікі Беларусь. Вядуцца пошукі нацыянальнай культурнай ідэнтычнасці, а таксама асэнсаванне сусветнай філасофскай традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Зараз мы можам сказаць аб унікальным становішчы ў беларускай філасофіі і культуры ў цэлым. Адбываецца яе самаасэнсаванне.

## Літаратура

1 Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Т. 1. Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал. : В. Б. Евароўскі [і інш.]. – Мінск, 2008. – 576 с.

2 Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне / С. І. Санько [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 840 с.

3 Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / аўтары тома : В. Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал. : В. Б. Евароўскі [і інш.] ; Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – Т. 3. Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. – 615 с.

4 Козел, А. А. Философская мысль Беларуси / А. А. Козел. – Мн. : Амалфея, 2004. – 270 с.

5 Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX стагоддзі: Энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] – Мн.: БелЭн, 1995. – 480 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Літаратура


1 Антология мировой философии : в 4 т. – М. : Мысль, 1969–1972.

Т. 1. Философия древности и средневековья. – 1969. – 936 с.

Т. 2. Европейская философия от эпохи Возрождения по эпоху Просвещения. – 1970. – 776 с.

Т. 3. Буржуазная философия конца XVIII в. – первых двух третей XIX в. – 1971. – 760 с.

Т. 4. Философская и социологическая мысль народов СССР XIX в. – 1972. – 708 с.

2 История философии : Энциклопедия / гл. науч ред. А. А. Грицанов. – Мн. : Интерпрессервис; Книжный дом, 2002. – 1376 с.

3 Гісторыя філасофіі : вуч. дапам. для студ. выш. навуч. установаў / Ч. С. Кірвель [і інш.]; пад рэд. Ч. С. Кірвеля. – Гродна : ГрДУ, 1997. – 917 с.

4 Реале, Д. Западная философия от истоков до наших дней : в 4 т. / Д. Реале, Антисери Д. ; [ пер. с итал. С. Мальцевой]. – СПб. : Петрополис,1994–1997.

Т. 1. Античность. – 336 с.

Т. 2. Средневековье (От библейского послания до Макиавелли). – 368 с.

Т. 3. Новое время (От Леонардо до Канта). – 714 с.

Т. 4. От романтизма до наших дней. – 880 с.

5 Скирбекк, Г. История философии / Г. Скирбекк, Н. Гилье. – М. : ВЛАДОС, 2000 – 800 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ